Хатынь: малавядомыя старонкі

СТАР. 3

Вясна мітрапаліта

СТАР. 3

Просты смех у спектаклі пра вайну

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 2015 г. СУБОТА № 54 (27912) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ДАМАЎЛЯЦЦА І ПА-ДЗЕЛАВОМУ ВЕСЦІ СПРАВЫ,

каб разам паспяхова супрацьстаяць крызісам і выклікам

Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі, Казахстана і Расіі адбылася ўчора ў Астане, паведамляе БЕЛТА. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі існуючыя гандлёва-эканамічныя выклікі ў рабоце Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама разгледзелі некаторыя пытанні міжнароднага парадку дня, якія закранаюць інтарэсы трох краін.

Фота БЕЛТА.

На сустрэчы з прэзідэнтамі Расіі і Казахстана Уладзімірам Пуціным і Нурсултанам Назарбаевым Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Напярэдадні 70-годдзя Перамогі зразумела, што мы павінны быць разам. Вельмі ж шмат выклікаў, дайшло ўжо да гісторыі, у тым ліку са спробай нават не перапісаць, а перакрэсліць нашу агульную гісторыю, таму і эканамічна, і палітычна мы павінны напярэдадні 70-годдзя Перамогі прадэманстраваць сваё адзінства».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што кожны год даводзіцца рэагаваць на новыя выклікі. На яго думку, час пацвярджае, што Еўразійскі эканамічны саюз быў створаны своечасова. «Больш за тое, гэта не проста дэкларацыя — мы вялікую колькасць дакументаў прынялі, фармалізавалі яго, падпісаўшы шэраг пагадненняў. І ў рамках нашага саюза мы павінны рэагаваць на гэтыя выклікі», — сказаў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, ёсць складаныя пытанні, якія трэба вырашаць, але ёсць і простая формула для таго, каб тавараварот унутры нас рос — трэба гандляваць уласнымі таварамі. І мы пра гэта гаварылі. «Арыентацыя на тое, каб наш унутраны рынак запоўніць уласнымі таварамі — гэта пытанне нумар адзін. Для нарошчвання тавараабароту ўнутры саюза неабходна забяспечыць зняцце бар'ераў. Іх быць не павінна. Тады прасцей будзе яго нарошчваць».

Пры гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што не трэба забываць і пра іншых членаў саюза, якім павінны быць прапанаваны варыянты развіцця падзей на перспектыву.

Перамовы прэзідэнтаў у Астане былі непрацяглымі, але вельмі насычанымі і змястоўнымі. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі ўвесь комплекс узаемаадносін паміж Беларуссю, Казахстанам і Расіяй. Краіны аб'ядноўваюць цесныя гандлёвыя і інвестыцыйныя сувязі. Сукупны ВУП «тройкі» складае 85% валавога прадукту СНД. Расія займае першае месца ў знешнім гандлі Беларусі і Казахстана. Па выніках 2014-га расійскі тавараварот з гэтымі дзвюма дзяржавамі склаў амаль $60 млрд. Беларусь і Казахстан разам займаюць трэцяе месца ў гандлёвым балансе Расійскай Федэрацыі. Пашыраецца інвестыцыйнае ўзаемадзеянне. Аб'ём расійскіх капіталаўкладанняў у эканоміку Беларусі і Казахстана дасягнуў $18 млрд, у сваю чаргу Беларусь і Казахстан уклалі ў Расію каля $10 млрд. Створаны і дзейнічаюць больш за 7 тысяч сумесных прадпрыемстваў.

Уладзімір Пуцін лічыць, што важным напрамкам партнёрства з'яўляецца прамыслова-тэхналагічная кааперацыя. Ажыццяўляюцца сумесныя праекты ў машынабудаванні, умацоўваюцца сувязі ў касмічнай сферы, рэалізуецца дарожная карта па сумесным выкарыстанні касмадрома Байканур на 2014-2016 гады. Цесна пераплецены энергетычныя галіны трох дзяржаў — яны ўзаемадзейнічаюць у сферы здабычы, транспарціроўкі і перапрацоўкі вугляводароднай сыравіны. Расія аказвае дапамогу Беларусі і Казахстану ў развіцці ядзернай энергетыкі. «Расатам» узводзіць атамную электрастанцыю ў Беларусі, дзе першы энергаблок будзе запушчаны ўжо ў 2018 годзе, а таксама працуе над будаўніцтвам першай АЭС у Казахстане і вядзе сумесную здабычу ўрану.

Асобна была закранута сітуацыя ў глабальнай эканоміцы, якая застаецца нестабільнай. «Нізкая дзелавая актыўнасць, застой сусветнай гаспадаркі, валацільнасць сыравінных рынкаў прама адбіваюцца на краінах СНД. У 2014 годзе сукупны прырост ВУП дзяржаў Садружнасці склаў толькі 0,9%, сёлета і зусім чакаецца некаторы спад, прыкладна на 1,4%», — сказаў кіраўнік расійскай дзяржавы.

СТАР. 2

БІЗНЕС НА... МЯДЗВЕДЗЯХ



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Падворак Аляксандра ШЫРВЕЛЯ *(на здымку ў цэнтры)* **з вёскі Літва, што на Стаўбцоўшчыне, упрыгожваюць драўляныя фігуркі розных істот. Але найбольш майстар любіць мядзведзяў. Скульптуры «братоў нашых меншых» ён выразае з мяккіх парод дрэў, такіх як асіна, таполя, ліпа. Гэта не толькі хобі, але і занятак, што прыносіць заробак: чатыры гады таму Аляксандр зарэгістраваўся ў якасці рамесніка.Старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Аркадзь КАЗЯКОЎСКІ** *(крайні злева)*, **стараста вёскі Літва Галіна ЖДАНОВІЧ, старшыня Літвенскага сельвыканкама Тадэвуш ГАЛАВАЧ наведалі прадпрымальніка, каб азнаёміцца з яго новымі работамі, пацікавіцца, як ідуць справы.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:

«Зараз адбываецца трансфармацыя эканомікі ва ўсіх краінах, і ў кожнай ёсць пласт індывідуальных прадпрымальнікаў. У Беларусі ў гандлёвым малым бізнесе працуе больш за 250 тысяч чалавек. І трэба разумець, што іх праблемы — гэта не праблемы асобнага ІП, які не можа рэалізаваць тавары. Ён знаходзіцца ў ланцужку многіх эканамічных суб'ектаў. Гэта гандлёвыя цэнтры і рынкі, якія пустуюць, калі прадпрымальнікі маюць цяжкасці; незавершаныя праекты гандлёвых аб'ектаў, у будаўніцтва якіх трэба ўкладаць грошы, у той час як гандаль прастойвае. Акрамя таго, мясцовыя бюджэты залежаць ад падаткаў, што паступаюць ад малога бізнесу. Але сёння ўжо ёсць разуменне ўсяго гэтага з боку дзяржавы, намеціўся канструктыўны дыялог. Многія нашы прапановы з праекта Нацыянальнай платформы бізнесу былі пачутыя».

■ Педсавет

АДЗНАКА Ў ШКОЛЕ: ПЕРНІК ЦІ БІЗУН?

Ці трэба адмаўляцца ад безадзнакавага навучання ў пачатковай школе

Школьная адзнака даўно стала такім жа абавязковым атрыбутам, як класная дошка або партфель. Што звычайна жадаюць школьніку? Добрых адзнак... Раней шкалярам жадалі вучыцца на «пяцёркі», а, каб кагосьці пахваліць, звычайна казалі, што «зроблена на пяць балаў». Цяпер жа індыкатарам школьнай паспяховасці сталі «дзясяткі», але што змянілася ў прынцыпе? У многіх сем'ях нават «сямёрка», атрыманая дзіцем, становіцца трагедыяй!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Як вядома, зараз рыхтуюцца змяненні ў Кодэкс аб адукацыі. І адна з прапаноў тычыцца вяртання ў пачатковую школу адзнак. На дадзены момант увогуле без адзнак навучаюцца вучні першых і другіх класаў. А ў трэціх і чацвёртых — не выстаўляюцца адзнакі па такіх прадметах, як «выяўленчае мастацтва», «працоўнае навучанне», «музыка» і «фізічная культура і здароўе».

Трэба прызнаць, што ў безадзнакавага навучання ёсць як прыхільнікі, так і апаненты. Апошнія ўказваюць на недасканаласць гэтай сістэмы і вялікую нагрузку пры запаўненні дакументацыі, якая кладзецца на настаўнікаў пачатковых класаў. Ім, акрамя класнага журнала, даводзіцца запаўняць яшчэ і журнал сістэматычнага ўліку ведаў, уменняў і навыкаў, ствараць партфоліа для сваіх вучняў і прыдумляць розныя іншыя спосабы (зорачкі, сонейкі, флажкі і гэтак далей), каб зафіксаваць рух наперад у вучобе сваіх вучняў. Да таго ж без выстаўлення адзнакі ў дзённік цяжка растлумачыць бацькам, на якім узроўні развіцця знаходзіцца іх дзіця.

СТАР. 2

■ Надвор'е

На выхадныя — дождж з мокрым снегам

А ўначы на панядзелак падмарозіць да мінус 13

У нядзелю нас пачне накрываць хваля холаду. Уначы паўсюдна, а ўдзень на поўдні будуць ісці кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж). У асобных раёнах магчымы галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па поўначы пры праясненнях — да 6-9 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, па поўдні — да 7 цяпла, паведаміла начальнік сектара Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Таццяна ЧАТЫРКО.

У панядзелак ападкі амаль знікнуць. Толькі на поўначы краіны магчымыя мокры снег і дождж, а таксама слабы галалёд. Стане яшчэ халадней. Уначы на панядзелак 4-10 марозу, а месцамі пры праясненнях да мінус 13 градусаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 0-5 цяпла, а па поўдні — да плюс 7 градусаў.

У аўторак мы трапім пад уплыў чарговага франтальнага раздзелу. Таму месцамі будзе ісці мокры снег і дождж. Уначы і раніцай месцамі слабы галалёд і галалёдзіца на дарогах. Уначы на аўторак будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — 2-8 цяпла, а па паўднёвым захадзе да плюс 9-12 градусаў. Сіноптыкі прагназуюць, што ў сераду стане яшчэ на некалькі градусаў цяплей.

* * *

Начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Белгідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ адзначыў, што на большую частку краіны вясна прыйшла на месяц раней, прыкладна 19-20 лютага, і ўвогуле дзве цяплейшай за звычайную. Першая дэкада сакавіка апынулася анамальна цёплай, сярэдняя тэмпература была вышэй за кліматычную норму на 6-8 градусаў. Так цёпла ў гэты час у нашай краіне бывае прыкладна раз у 15-20 гадоў. «І да канца сакавіка сярэдняя тэмпература па краіне будзе вышэй за кліматычную норму на 2-4 градусы», — упэўнены Дзмітрый Рабаў. У красавіку і маі сярэдняя месячная тэмпература паветра таксама чакаецца вышэйшай за кліматычную норму.

Сяргей КУРКАЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕС захавае санкцыі супраць Расіі да выканання мінскіх пагадненняў

Саміт ЕС прыняў палітычнае рашэнне падтрымліваць санкцыі супраць Расійскай Фэдэрацыі, пакуль не будзе цалкам выкананы мірны план па Украіне. Пра гэта заявіў кіраўнік Еўрапейскага савета Дональд Туск. Перад самітам звесткі пра падаўжэнне санкцый паступалі супярэчлівыя: афіцыйна лідары пагаджаліся, што змякчэнне санкцый немэтазгоднае, у той жа час СМІ паведамлялі, што ёсць цэлая група краін — «сяброў Расіі», якія выступаюць за змякчэнне рэжыму. На прэс-канферэнцыі Туск заявіў: «Была дасягнута згода, што санкцыйны рэжым наўпрост увязаны з поўным выкананнем мінскіх дамоўленасцяў». Паводле ацэнкі кіраўніка Еўрасавета, рэалізацыі мірнага плана можна чакаць не раней чым да канца года. Пры гэтым фармальнае рашэнне аб працягу санкцый прынята не было. Але Туск лічыць, што гэта не важна: «Галоўнае, што мы ўвязалі дзеянне санкцый з выкананнем мінскіх дамоўленасцяў».

ЗША пачнуць трэніроўкі байцоў Нацгвардыі Украіны напрыканцы красавіка

Інструктары ЗША, якія будуць навучаць байцоў Нацыянальнай гвардыі Украіны, прыбудуць у Львоўскую вобласць ужо ў красавіку. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар Пентагона палкоўнік Стыў Уорэн (перадае Reuters). Трэніроўкі, па яго словах, пачнуцца ў канцы месяца, дакладная дата пакуль невядомая. Уорэн удакладніў, што ў навучанні трох батальёнаў Нацгвардыі прымуць удзел каля 290 байцоў 173-й паветрана-дэсантнай брыгады ЗША, якая базіруецца ў італьянскім горадзе Вічэнца. Трэніроўкі пройдуць у Яваравскім навучальным цэнтры. Пра хуткі іх пачатак для 780 украінскіх вайскоўцаў раней аб'явіў віцэ-прэзідэнт ЗША Джозаф Байдэн. Ён таксама паведаміў, што ў канцы сакавіка Кіеў атрымае першую партыю ваенных аўтамабіляў для ўзмацнення абараназдольнасці краіны.

Абама прыгразіў Нетаньяху пераглядам саюзніцкіх адносін

Прэзідэнт ЗША Барак Абама выказаў незадаволенасць заявай прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху і папярэдзіў, што Вашынгтон можа «перагледзець варыянты» адносін са сваім блізкаўсходнім саюзнікам. Сваю пазіцыю Абама выказаў падчас тэлефоннага званка ізраільскаму прэм'еру. Раней, у ходзе перадвыбарнай кампаніі, Нетаньяху заяўляў, што не дапусціць стварэння незалежнай палесцінскай дзяржавы. Пазней у інтэрв'ю NBC ён змякчыў сваю пазіцыю і заявіў, што выступае за мірнае суіснаванне дзвюх дзяржаў, аднак абмовіўся: для гэтага «павінны змяніцца абставіны».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Соль значна больш небяспечная, чым лічылася раней

Яна пашкоджвае сасуды, сэрца, ныркі і мозг нават у тых, чый артэрыяльны ціск не павышаецца праз празмернае спажыванне солі. Спецыялісты з Дэлаверскага ўніверсітэта прааналізавалі ўсю наяўную інфармацыю па гэтай тэме. Яны высветлілі: соль парушае функцыю эндатэлія, які высцілае сценкі крывяносных сасудаў (піша WebMD). Акрамя таго, яна знімае эластычнасць артэрый. Дыета з высокім утрыманнем натрыю можа прывесці да гіпертрафіі левага жалудачка сэрца. Мышца жалудачка ўшчыльняецца, і яго сценка губляе эластычнасць. Гэта небяспечна для здароўя сардэчна-сасудзістай сістэмы. Да таго ж, даўно вядома, што соль негатыўна ўплывае на ныркі. Злоўжыванне ёю адбіваецца і на нервовай сістэме. Яе пастаянная гіперактыўнасць можа прывесці да негатыўных наступстваў.

КАРОТКА

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці з 20 па 22 сакавіка правядзе масіраваную адпрацоўку аўтадарогі М6 Мінск — Гродна. Інспектары плануюць пракантраляваць выкананне патрабаванняў правіл дарожнага руху ўсімі яго ўдзельнікамі.

Паводле слоў дырэктара ПВТ Валерыя Цапкалы, сёння зарплаты беларускіх праграмістаў вышэйшыя, чым у іх калег у Чэхіі, Польшчы, Венгрыі і шэрагу іншых краін Усходняй Еўропы.

Новы Водны кодэкс, які ўступае ў сілу з 21 мая 2015 года, адмяняе забарону на размяшчэнне ў водаахоўных зонах жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў, а таксама аб'ектаў захоўвання нафты і нафтапрадуктаў.

Міжнародная федэрацыя футбола (ФІФА) прыняла рашэнне ўпершыню правесці фінальную стадыю чэмпіянату свету 2022 года ў лістападзе—снежні. Гэта звязана з тым, што першынство адбудзецца ў Катары, дзе летам тэмпература паветра вышэйшая за 40 градусаў і гуляць у футбол без шкоды для здароўя практычна немагчыма. Фінальны паядынак за Кубак свету пройдзе 18 снежня 2022 года ў горадзе Доха.

ВЫБРАУСЯ НА ПРЫРОДУ? ШАНУЙ ЭКАЛОГІЮ!

У краіне пачынаюцца экалагічныя рэйды ў месцах масавага адпачынку

Сістэматычны кантроль за вадаёмамі і лясамі паказвае, што большасць парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства звязана з вельмі нізкім узроўнем экалагічнай культуры пэўнай часткі насельніцтва. Здавалася б, што можа быць прасцей — не ставіць аўтамабіль блізка да вады і высыпаць смецце ў спецыяльную урну? Аднак штогод супрацоўнікі ведамства складаюць на адпачывальнікаў тысячы пратаколаў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Начальнік упраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Сцяпан ДУБНІЦКІ, начальнік аддзела дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем земляў, лясоў, жывёльнага і раслінага свету Мінгаркампрыроды Мікалай КАЗАК і начальнік Мінскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр МАКОВІК парушальнікаў на Заслаўскім вадасховішчы не выявілі.

Сонечнай сакавіцкай раніцай прадстаўнікі міністэрства адправіліся ў рэйд на два пляжы Заслаўскага вадасховішча, каб праінспектаваць іх стан перад пачаткам цёплага сезона.

— Мы выконваем даручэнні Прэзідэнта і ўрада не толькі па навядзенні парадку на зямлі і падрыхтоўцы зон масавага адпачынку да цёплага сезона, але і па стварэнні ўмоў для камфортнага адпачынку людзей у гарадскіх і прыгарадных зонах, — гаворыць **начальнік упраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Сцяпан ДУБНІЦКІ.** — Для гэтага мы рэгулярна адпраўляемся ў рэйды па ўзбярэжжы вадаёмаў і лясных зонах. Пачынаючы з красавіка, запрацуюць складзеныя тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды графікі кантролю і аб'езду зон масавага адпачынку.

Большая частка парушэнняў выяўляецца рэвізорамі якраз улетку. Прыпадае яна часцей за ўсё на грэбаванне правіламі паркоўкі аўтамабіляў ля вадаёма. І хоць ужо неаднаразова эколагі казалі, што ставіць «жалезная каня» бліжэй за 30 метраў да вады забаронена, спыняе гэта не ўсіх кіроўцаў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ДАМАЎЛЯЦЦА І ПА-ДЗЕЛАВОМУ ВЕСЦІ СПРАВЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзімір Пуцін адзначыў, што на сустрэчы ішла гаворка пра сітуацыю ва Украіне. Прэзідэнт Расіі адзначыў актыўны ўдзел Аляксандра Лукашэнкі і Нурсултана Назарбаева па садзейнічанні ва ўрэгуляванні гэтай праблемы. «Дзякуючы дасягнутым у Мінску 12 лютага пагадненням з'явілася рэальная магчымасць для паэтапнай дээскалацыі ўзброенага канфлікту. Вельмі разлічваем на тое, што ўлады ў Кіеве будуць цалкам выконваць дасягнутыя ў Мінску дамоўленасці», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін. Прэзідэнт Расіі дадаў, што на сустрэчы былі закрануты і іншыя аспекты рэгіянальнага парадку дня.

Паводле слоў Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева, для Еўразійскага эканамічнага саюза 2015-ты з'яўляецца годам вялікага выкліку. «Цяперашні крызіс выкліканы рэзкім зніжэннем коштаў на энерганосьбіты. У сувязі з гэтым у ЕАЭС панізіўся таварааварот. Мы меркавалі, што такія рызыкі будуць. Наша задача сёння — дамовіцца і вельмі па-дзелавому нашым урадам абмеркаваць гэта. 2015-ты — вялікая рызыка і вялікі выклік для ЕАЭС», — сказаў ён.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся развіваць гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва, даручыўшы урадам прапрацаваць пытанні, якія спрыяюць аднаўленню росту аб'ёмаў гандлю. Прэзідэнты таксама прынялі рашэнне працягваць практыку падобных нефармальных сустрэч, каб абмяркоўваць і прымаць аператыўныя рашэнні па рэагаванні на крызісныя з'явы.

Уладзімір Пуцін запрасіў прэзідэнтаў Беларусі і Казахстана прыняць удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах у Маскве, якія пройдуць з нагоды 70-годдзя Перамогі, агульнай святой даты для трох краін. Ён таксама адзначыў, што ў парадзе на Краснай плошчы 9 Мая разам з расійскімі прымуць удзел беларускія і казахстанскія ветэраны.

Пасля заканчэння трохбаковай сустрэчы прэзідэнты Беларусі, Казахстана і Расіі наведалі бібліятэку першага Прэзідэнта Казахстана. Кіраўнікі дзяржаў пагутарылі з юнымі наведвальнікамі бібліятэкі. Аляксандру Лукашэнку і Уладзіміру Пуціну былі ўручаны электронныя чытацкія білеты.

Напярэдадні ў рамках рабочага візіту беларускага кіраўніка ў Астану адбылася двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Казахстана Аляксандра Лукашэнкі і Нурсултана Назарбаева. «У нашых двухбаковых адносінах, здаецца, усё не так дрэнна. Хоць запаволенне ёсць і хацелася б, каб перш за ўсё гандаль развіваўся нармальнымі тэмпамі. Але вядомыя падзеі звонку, абвал расійскага рубля амаль у два разы, вядома ж, паўплывалі на сітуацыю ўнутры Казахстана, унутры Беларусі», — сказаў беларускі лідар.

«Да месца ваша запрашэнне, спроба абмеркаваць гэтую сітуацыю і, калі трэба, прыняць рашэнне. Таму што нас гэта насцярожвае. Тэмпы негатыўныя назапашваюцца, і многае залежыць тут ад Расійскай Федэрацыі, мы ўтрох павінны знайсці выхад з гэтага становішча так, каб наш саюз аказаўся і надалей прывабным, каб людзі бачылі, што ў нас станоўчая дынаміка, хаця б унутры нашага саюза», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Беларускі лідар звярнуў увагу таксама на прэзідэнцкую перадвыбарчую кампанію, якая праходзіць у Казахстане. «Вы ведаеце наша стаўленне да вас, ведаеце, што мы за вас вельмі перажываем, зычым вам перамогі. Я ведаю, што казахстанскі народ ставіцца да вас з вялікай увагай і цеплынёй, але як бы ні склалася гэтая прэзідэнцкая кампанія, нам трэба думаць пра будучыню», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Учора візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Казахстан завяршыўся.

■ Парламенцкі дзённік

Роля народнай дыпламатыі

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з прадстаўнікамі кітайскай творчай інтэлігенцыі падкрэсліў значнасць гуманітарнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая.

«Духоўная дыпламатыя, духоўнае і гуманітарнае супрацоўніцтва — неаддзельныя рэчы ад гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Таксама ён адзначыў, што, вядома, трэба разумець вялікую стваральную ролю органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку міністэрстваў замежных спраў, але народная дыпламатыя і ўдзел у кантактах і супрацоўніцтве людзей, якія заняты ў гуманітарнай сферы (мастакоў, пісьменнікаў і г.д), — вялікая справа, што аб'ядноўвае народы. «Гэта тыя карані, якія сілкуюць наша супрацоўніцтва», — адзначыў спікер.

Міхаіл Мясніковіч таксама падкрэсліў, што яму асабліва прыемна бачыць сярод членаў кітайскай дэлегацыі дзеячаў культуры мастака Ляна Юнхэ. Ён пазітыўна ацаніў той факт, што ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі 19 сакавіка адкрылася выстаўка гэтага творцы.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў важнасць таго, што візіт кітайскіх дзеячаў культуры праходзіць напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі. І беларускі, і кітайскі народы перажылі вельмі шмат у гады барацьбы за незалежнасць сваёй Радзімы, адзначыў спікер, маючы на ўвазе барацьбу з захопнікамі ў час Другой сусветнай вайны.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПАКУЛЬ ЖЫВЫЯ СВЕДКІ ВАЙНЫ

Другі этап грамадзянска-патрыятычнай акцыі «Вялікая Перамога — вечная памяць» прайшоў учора ў Палаце прадстаўнікоў. Ініцыятарам шэрагу мерапрыемстваў выступіў дэпутат ад Гомельскай Цэнтральнай выбарчай акругі Алег ЛЕЎШУНОЎ.

Навучэнцы гомельскіх школ і гімназій разам з выхаванцамі кадэцкіх класаў, прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны Гомеля наведалі ў рамках акцыі Палату прадстаўнікоў. Алег Леўшуноў, які праводзіў для іх экскурсію, прызнаўся: памяць пра ваенныя гады мае вялікае значэнне для яго асабіста.

— Мне як ветэрану баявых дзеянняў у Афганістане і ўнуку ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, кавалера двух ордэнаў, вельмі блізкая гэта тэма, — адзначыў дэпутат.

Удзельнікі акцыі падчас учарашняга мерапрыемства наведалі таксама музеі беларускай дзяржаўнасці і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

— Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне дасталася нам вельмі нялёгка, — заявіў Алег Леўшуноў. — Беларусы павінны свята захоўваць і шанаваць памяць пра яе, таму што забыццё можа прывесці ў тым ліку і да спробаў перапісаць гісторыю. Гэтага дапусціць нельга. І пакуль яшчэ жывыя ветэраны, відавочцы тых падзей, мы павінны расказваць, якімі намаганнямі дасталася нам Вялікая Перамога.

Гасцям дэпутаты расказалі пра спецыфіку працы айчыннага парламента, а таксама ўручылі маладым гамяльчанам пашпарты грамадзян нашай краіны. Разам з гэтым прайшла цырымонія прыняцця школьнікаў у Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Акцыя «Вялікая Перамога — вечная памяць» стартавала 18 сакавіка ў Гомельскім абласным музеі ваеннай славы. Яна прысвечана 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Году моладзі і 75-му юбілею Цэнтральнага раёна Гомеля. З сакавіка па ліпень пройдзе шэраг мерапрыемстваў, у якіх прымуць удзел дэпутаты рознага ўзроўню, работнікі адміністрацый, актывісты раённых грамадскіх аб'яднанняў, настаўнікі, навучэнцы.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Погляд

БАНК БУДУЧЫНІ

Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый, які Кітай прапанаваў стварыць у мінулым годзе для рэалізацыі маштабных інфраструктурных праектаў у рэгіёне, стаў сапраўдным яблыкам разладу паміж амерыканцамі і іх саюзнікамі. На днях пра сваё рашэнне далучыцца да новага праекта Кітая абвясціла Вялікабрытанія, чым выклікала град раздражнёных папрокаў з боку Вашынгтона. Маўляў, амерыканцы не чакалі, што найбліжэйшы саюзнік будзе спрыяць рэалізацыі праекта, што прынясе дадатковыя геапалітычныя і геаэканамічныя бонусы Кітаю, які разглядаецца ЗША ў якасці галоўнага саперніка ў барацьбе за звышдзяржаўны статус у бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Чым жа выклікана такое «непаслушэнства» з боку Вялікабрытаніі амерыканцам? Дружба дружбай, думаюць брытанцы, а грошы паасобку. Як уладальнік аднаго з самых буйных фінансавых цэнтраў свету, эліта Вялікабрытаніі цалкам здольная ўбачыць свае фінансавыя інтарэсы ў новым праекце Кітая, і губляць вельмі сур'ёзныя дывідэнды з-за страхаў ЗША брытанцам абсалютна не хочацца. Урэшце, сама Вялікабрытанія аднойчы ўжо звышдзяржаўнага статусу пазбавілася, і, хоць гэта і было балюча, цяпер яно ўжо ў мінулым. І брытанцам зусім не хочацца страчваць свае грошы з-за боязі амерыканцаў пайсці па тым жа шляху.

У лонданскім Сіці выдатна разумеюць, што як у Кітая, так і ў Азіяцка-ціхаакіянскага рэгіёна (АТР) у цэлым выдатныя перспектывы ў будучыні. АТР імкліва становіцца цэнтрам сусветнай эканомікі, а кітайская эканоміка неўзабаве будзе не толькі цэнтрам АТР, але і цэнтрам сусветнай эканомікі ў цэлым. Гэта азначае, што ў выйгрышы будуць тыя краіны, якія пачнуць супрацоўніцтва з Кітаем на максімальна раннім этапе развіцця. Вялікабрытанія ўжо шмат інвеставала ў папярэднія дзесяцігоддзі ў эканоміку Кітая, брытанскія інвестары зрабілі на росце Кітая ў папярэднія гады шматмільярдны капітал і знаходзяцца ў прадчуванні чарговых прыбыткаў. І не Амерыцы прапаноўваць брытанскаму бізнесу адмовіцца ад зіхатлівых перспектыў зарабляць і далей добрыя грошы на супрацоўніцтве з КНР. Тым больш што гаворка ідзе пра магчымасць укладвацца ў развіццё інфраструктуры цэнтра сусветнай эканомікі. А чым больш у рэгіёне будзе развітая інфраструктура, тым лягчэй будзе брытанскаму бізнесу рэалізоўваць выгадныя для сябе праекты ў рэгіёне і забяспечваць цесную сувязь брытанскай эканомікі з АТР.

Зразумелыя папрокі ЗША ў адрас Кітая, што, ствараючы новыя фінансавыя інстытуты з дамінуючай доляй кітайскіх укладаў, кітайцы імкнуцца ўзмацніць свой геапалітычны ўплыў. Але, уласна кажучы, хіба самі амерыканцы дбаюць пра нешта іншае? Узяць хаця б рэформу МВФ. Ужо амаль пяць гадоў прайшло з таго часу, як першасна ўзгаднілі павелічэнне ў МВФ квоты Кітая з-за рэзкага росту прапорцыі кітайскай эканомікі ў агульнасусветнай, але ЗША, пагадзіўшыся спачатку, на справе зацягваюць рэалізацыю рашэння ў выццё. З простай прычыны — не жадаючы змяншаць сваю квоту да памеру, які не дазволіць ім блакіраваць асноўныя рашэнні ў МВФ. І цалкам зразумела, што калі ЗША самі сябе паводзяць такім чынам, то ў іх няма ніякага маральнага права настойваць на тым, каб Кітай, не маючы справядлівай магчымасці павялічыць свой уплыў у існуючых фінансавых інстытутах, не засноўваў новыя.

Вельмі важнай прычынай для Кітая стваряць разнастайныя рэгіянальныя і глабальныя фінансавыя ўстановы таксама з'яўляецца перанасычанасць кітайскай эканомікі залішнімі фінансавымі сродкамі. Залатавалютныя рэзервы наблізіліся да чатырох трыльёнаў доларaў, у дзяржаўных фондах яшчэ каля трыльёна, і яшчэ шмат трыльёнаў доларaў змяшчаецца ў актывах найбуйнейшых банкаў Кітая. Ажыццяўляючы вельмі паспяховы бізнес, кітайскія бізнесмены празмерна насычылі эканоміку Кітая грашыма, што непазбежна цягне ўзнікненне на рынку разнастайных «бурбалак» і прывядзіць да неабгрунтаванага росту коштаў на нерухомасць. Ствараючы новыя міжнародныя фінансавыя інстытуты, можна частку гэтых грошай перакінуць у іншыя краіны, укладваючы іх у статутны фонд новых інстытутаў для крэдытавання разнастайных праектаў.

Па яшчэ непацверджанай афіцыйна інфармацыі, шляхам Вялікабрытаніі збіраюцца рушыць услед і іншыя еўрапейскія краіны, у тым ліку такія буйныя эканомікі, як французская, нямецкая і італьянская. Яны таксама дзесяцігоддзямі зараблялі на ўкладаннях у кітайскую эканоміку і не маюць намеру адмаўляцца ад відавочных выгод для свайго бізнесу, натхняючыся прыкладам Вялікабрытаніі. А ўслед за імі могуць рушыць услед і такія верныя саюзнікі ЗША ў АТР, як Аўстралія і Паўднёвая Карэя. У выніку амерыканцы рызыкуюць апынуцца ў адзіноце ў сваім крыжовым паходзе супраць Кітая. Што і нядзіўна — кітайцы ў апошнія гады ўсё лепш авалодваюць інструментамі мяккай сілы. Нікуды не ўрываючыся і нікога не прымушаючы да прыняцця рашэнняў сілай, яны набываюць усё больш і больш прыхільнікаў, проста ствараючы для іх стымулы супрацоўнічаць. І гэта нядрэнны ўрок для амерыканцаў, якія сумна праславіліся імкненнем навязваць свае інтарэсы з дапамогай ваенных аперацый і каляровых рэвалюцый.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Факт

ПАЛЁГКА БЫТОВАК

Хутка прыватныя кампаніі, якія працуюць у сферы бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва, зраўняюць па арэндных ільготах з камунальнымі структурамі. Пра гэта паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.

Гэта, у прыватнасці, прадугледжана праектам указа «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 2012 г. № 150». Акрамя таго, у дакументе будуць улічаны і заўвагі Беларускага саюза прадпрымальнікаў, Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, што былі выказаны на пагаджальнай нарадзе ў Дзяржкаммаёмасці.

Праектам прадугледжваецца распаўсюдзіць на арганізацыі прыватнай формы ўласнасці норму прадастаўлення ў асобных выпадках дзяржаўнай нерухомай маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне. Пры гэтым прыватныя структуры, гэтак жа як і камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы і гаспадарчыя таварыствы, у статутных фондах якіх больш за 50% акцый (доляў) знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, павінны будуць ажыццяўляць у сельскіх населеных пунктах і посёлках гарадскога тыпу дзейнасць у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Сяргей КУРКАЧ.

«КАР'ЕРНЫ ДЗЕНЬ» ДЛЯ СТУДЭНТАЎ СТАЛІЧНЫХ ВНУ

«Дзень кар'еры — вясна-2015» пройдзе 25 сакавіка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (Ліцэй БДУ, вул. Ульянаўская, 8). Пачатак у 10.00.

Асаблівасцю вясновага сезона стане маштабнасць яго правядзення. У гэты раз прапановамі «Дня кар'еры» змогуць скарыстацца не толькі студэнты БДУ, але і студэнты ўсіх сталічных ВНУ. Свае вакансіі ім прапануюць больш за дваццаць айчынных і замежных прадпрыемстваў розных сфер дзейнасці. Працадаўцы раскажуць моладзі пра магчымыя варыянты атрымання першага працоўнага месца, падпрацоўкі паралельна з вучобай, стажыроўкі і практыкі з перспектывай далейшага працаўладкавання. Ахвотныя змогуць адразу ж трапіць на гутарку і атрымаць адказы на пытанні, якія іх цікавяць.

Яшчэ адным новаўвядзенне стане правядзенне «круглага стала», прысвечанага працаўладкаванню моладзі ў сучасных умовах.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

АДЗНАКА Ў ШКОЛЕ...

ПЯЦЬДЗЯСЯТ НА ПЯЦЬДЗЯСЯТ

— Летась мы правялі апытанне сярод педагогаў пачатковай школы, цікавіліся іх меркаваннем: ці лічаць яны эфектыўнай сістэму безадзнакавага навучання ў першых і другіх класах, — расказала падчас «круглага стала» на тэму «Перспектывы навучання без адзнак у сярэдняй школе» **начальнік управлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.** — У апытанні былі задзейнічаны педагогі з усіх рэгіёнаў краіны. Іх меркаванні падзяліліся: 24% апытаных лічаць сістэму безадзнакавага навучання эфектыўнай, яшчэ столькі ж таксама лічаць гэты падыход эфектыўным, але пры ўмове, што настаўнікі будуць вызвалены ад залішняй дакументацыі, а 46% апытаных назвалі дадзены метад ацэнкі неэфектыўным і паведамілі, што, на іх думку, адмовіцца ад безадзнакавага навучання ў першым і другім класах можна.

40% рэспандэнтаў лічаць, што выстаўленне адзнак па дзесяцібальнай шкале неабходна ўводзіць з другога года навучання, а 33% лічаць магчымым перайсці да выстаўлення адзнак ужо з другога паўгоддзя першага класа.

Валянціна Гінчук расказала, што ў 2008—2012 гадах у Беларусі праходзіў эксперымент па апрабацыі безадзнакавага навучання вучняў трэціх і чацвёртых класаў па чатырох прадметах — «музыцы», «выяўленчым мастацтве», «працоўным навучанні» і «фізічнай культуры і здароўі». Па яго выніках была зроблена выснова, што навучэнцы якасна засвойваюць змест урокаў, паспяхова спраўляюцца з заданнямі трэцяга, чацвёртага і пятага ўзроўняў складанасці, дзе неабходна, скарыстоўваюць веды ў знаёмай і незнаёмай сітуацыі, у іх паніжаны ўзровень трывожнасці, яны не баяцца памыліцца і, самае галоўнае, у гэтых навучэнцаў сфарміраваліся ўнутраныя матывы да вучэбнай дзейнасці. Таму па выніках эксперымента гэтую мадэль укаранілі па ўсёй краіне.

Цікава, як змянялася стаўленне бацькоў да безадзнакавага навучання: калі ў пачатку эксперымента ідэю падтрымлівалі толькі 46% бацькоў, то на апошнім этапе іх было ўжо 63%. А вось спроба ўкараніць безадзнакавае навучанне ў пятым класе па прадмеце «выяўленчае мастацтва» правалілася. Педагогі канстатавалі зніжэнне ў дзяцей матывацыі...

На думку Валянціны Гінчук, незадаволенасць многімі настаўнікамі безадзнакавай сістэмай навучання тлумачыцца проста: ад педагога патрабуецца на кожным уроку даць змястоўную ацэнку рабоце кожнага вучня, каб той зразумеў, чаму ён навучыўся. А гэта сур'ёзная работа...

— Безадзнакавую сістэму навучання настаўнік павінен прыняць усім сэрцам, — падтрымлівае калегу **начальнік аддзела арганізацыйна-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу Нацыянальнага інстытута адукацыі Беларусі Лілія КУЗНЯЦОВА.** — Рэалізаваць гэту ідэю так, як яна задумвалася першапачаткова, можа толькі прафесіянал і адначасова творчы чалавек, таму што безадзнакавае навучанне не азначае, што яно безацэначнае. Форму фіксацыі вучэбных дасягненняў сваіх вучняў педагог выбірае сам. Таму безадзнакавая сістэма навучання вымагае ўдасканалення прафесійнай культуры настаўнікаў і правядзення інфармацыйна-тлумачальнай работы з бацькамі. Я, як прадстаўнік пачатковай школы, выступаю за безадзнакавае навучанне, якое стварае камфортную атмасферу ў школе і захоўвае псіхалагічнае здароўе дзіцяці. У школьнікаў адсутнічае страх перад урокамі, яны не баяцца дапусціць памылку. Мяркую, што перспектывы безадзнакавай сістэмы навучання напрамую залежаць ад таго, наколькі якасна рыхтуюць педагогаў у ВНУ. Ці надаюць там гэтай тэме належную ўвагу...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВЫПРАЎЛЕНАЯ ПАМЫЛКА — РУХ НАПЕРАД

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алы СЕМЯНОВІЧ,** адзін з прынцыпаў безадзнакавага навучання — спалучэнне якаснага і колькаснага складнікаў ацэнкі. Гэта значыць, што педагог ацэньвае не толькі прырост у ведах і ўменнях. Для яго значэнне мае здольнасць вучня адаптавацца да школьнага асяроддзя, уменне задаваць пытанні, кантактаваць...

— Для сістэмы безадзнакавага навучання характэрна неперарыўнае адсочванне таго, на якім этапе знаходзіцца кожны канкрэтны вучань, — тлумачыць Ала Семяновіч. — А пры дзесяцібальнай сістэме, якая ацэньвае толькі канчатковы вынік, ацаніць кожны крок дзіцяці немагчыма. Значыць, сёння трэба ставіць вучню «2», заўтра «4», потым «6», а якую тады выстаўляць яму адзнаку за чвэрць? Калі дзіця выпраўляе ўласную памылку — гэта прагрэс, рух наперад, але пры 10-бальнай сістэме выпраўленая вучнем у кантрольнай рабоце ці дыктоўцы памылка лічыцца недахопам і ўплывае на канчатковую адзнаку. Я разумею бацькоў, якім прасцей запытацца ў дзіцяці, што яно сёння атрымала... Добра, калі гэта будзе «10» ці «9» балаў, а калі «5» ці «6»? Але ж у кожнага дзіцяці — свой патэнцыял, і нельга чакаць, што ўсе будуць выдатнікамі. А безадзнакавае навучанне дазваляе дзецям не бачыць адзін у адным «выдатнікаў» і «двоечнікаў», «сераднячкоў» і «харашыстаў». Тым больш што суб'ектывізм заўсёды будзе прысутнічаць у ацэнцы, зробленай настаўнікам...

НЕ ЗЛАМАЦЬ ЖЫЦЦЁВЫ СЦЭНАРЫЙ

— Эйнштэйн пісаў, што калі рыбу ацэньваць па яе здольнасці ўзбірацца на дрэва, то яна ўсё жыццё пражыве з верай у сваю нікчэмнасць, — дзеліцца сваім меркаваннем **настаўнік-метадыст, кандыдат педагагічных навук, настаўніца пачатковых класаў Святлана ГІН.** — Што там складаната ў пачатковай школе? Прыкладна так разважаюць бацькі, упэўненыя, што дзіця наперакор ім вучыцца не хоча... Скажыце, калі дзіця вучыцца катацца на веласіпедзе і падае, ці злуемся мы на яго? Не, бо яно ж вучыцца. А чаму ў такім разе мы злуемся, калі дзіця вучыцца чытаць, лічыць і ў яго штосьці не атрымліваецца?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі вы бачыце, што дзіця вельмі заклапочана сваімі школьнымі адзнакамі, або вы самі перабольшваеце іх каштоўнасць, скарыстайцеся парадамі псіхолага.

ПАРАДА № 1.

Задумайцеся, наколькі вашы патрабаванні і чаканні суадносяцца з магчымасцямі дзіцяці. Не арыентуйце яго толькі на поспехі ў школе. Лепш дапамажыце вылучыць тыя прадметы, па якіх ён здольны атрымліваць высокія адзнакі.

ПАРАДА № 2.

Калі ў дзіцяці не ладзіцца з вучобай, паспрабуйце ўстрымацца ад папрокаў. Супакойце яго і растлумачце, што вы будзеце любіць яго незалежна ад адзнак, якія ён атрымлівае.

ПАРАДА № 3.

Часцяком бацькі перажываюць з прычыны дрэнных адзнак і заўваг з боку настаўніка значна больш, чым вучань. Не забывайцеся, што адзнака часта носіць суб'ектыўны характар. Паспрабуйце не драматызаваць школьныя няўдачы. Наадварот, падтрымайце дзіця і ўсяляйце ўпэўненасць у тым, што ў наступны раз у яго ўсё атрымаецца.

ПАРАДА № 4.

Калі дзіця стараецца, не скупіцеся на пахвалу. Нават калі яго намаганні і не прынясуць высокую адзнаку, ён будзе ведаць, што для вас важныя яго старанні і жаданне вучыцца. Пры гэтым не параўноўвайце яго поспехі з поспехамі іншых дзяцей. Сканцэнтруйцеся на тым, як ён вырас у параўнанні з самім сабой ранейшым, чаму новаму ён навучыўся.

ПАРАДА № 5.

Не варта занадта захапляцца найвышэйшымі баламі і гараваць праз нізкія. Не забывайцеся, што дзіця ў першую чаргу ідзе ў школу па веды.

ПАРАДА № 6.

Будзьце прыкладам. Калі маці — перфекцыяністка, то і дзіця можа вырасці з «сіндромам выдатніка». Не саромейцеся прызнавацца ў сваіх промахах і няўдачах. І дэманструйце пры гэтым разумнае стаўленне да пройгрышу.

Мне цікава было даведацца меркаванні саміх дзяцей наконт адзнак, таму я правяла ў школах Гомельскага рэгіёна міні-даследаванне. Апытаннем былі ахоплены 440 вучняў 3-х і 4-х класаў. Высветлілася, што 94% трэцякласнікаў жадаюць вучыцца з адзнакамі, а сярод чацвёртакласнікаў на карысць адзнак выказаліся 75%.

У той жа час большасць са школьнікаў хацела б атрымліваць толькі «9» і «10» балаў. Чаму? Як паведамілі самі дзеці, для таго, каб парадаваць сваіх бацькоў, якія сварацца нават за «сямёрку». Дзеці баяцца сустрэць неадабрэнне з боку маці ці бацькі і яшчэ больш баяцца пакарання. 57% школьнікаў паведамілі, што іх дрэнныя адзнакі выклікаюць негатыўную рэакцыю з боку бацькоў. Таму я лічу, што ўсе сілы трэба скіраваць на работу з дарослымі. А бацькам трэба спакойна ўспрымаць вынікі дзіцяці, у тым ліку адмоўныя...

Прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія ВАНІНА расказала, што аналіз зваротаў у Міністэрства адукацыі акрэсліў дзве галоўныя праблемы: высветлілася, што многія бацькі не ўмеюць размаўляць ні са сваімі дзецьмі, ні з настаўнікамі.

— У першакласніка і другакласніка, калі той прыходзіць дамоў, дагэтуль пытаюцца, што ён атрымаў у школе. Не цікавяцца, як той правёў дзень, ці спадабаўся яго малюнак... А адносіны бацькоў з настаўнікамі яшчэ больш складаныя. Ім значна прасцей задаць пытанне міністру адукацыі праз інтэрнэт, чым падысці да школьнага настаўніка. У міністэрства прыходзяць звароты, у якіх бацькі цікавяцца, чаму іх дзіцяці паставілі тую ці іншую адзнаку? А бацькі першакласнікаў і другакласнікаў не разумеюць, як ва ўмовах адсутнасці адзнак развіваецца іх дзіця. Чаму не запытацца пра тое ж у школьнага настаўніка?

— У школе, дзе вучацца мае дзеці, 40% зваротаў да школьнага псіхолага звязаны з ацэначна-адзнакавай дзейнасцю, — паведаміў **сямейны псіхолаг, бацька чатырох дзяцей Андрэй ТУРАВЕЦ.** — Многія сем'і зацікаўлены ў тым, каб іх дзіцяці паставілі зразумелую ім адзнаку. Мы арганізавалі ў школе «Клуб бацькоў». На першае месца пытанняў, якія іх хвалююць, мужчыны паставілі школьныя адзнакі. Высветлілася, што фізічнае пакаранне за дрэнныя адзнакі, на жаль, застаецца нормай для многіх сем'яў.

«Калі дзіця выпраўляе ўласную памылку — гэта прагрэс, рух наперад, але пры 10-бальнай сістэме выпраўленая вучнем у кантрольнай рабоце ці дыктоўцы памылка лічыцца недахопам і ўплывае на канчатковую адзнаку».

Па словах спецыяліста, да 7 гадоў у дзіцяці фарміруецца базавы жыццёвы сцэнарый. Але першы клас становіцца своеасаблівай пераломнай кропкай. І нават калі ў дзіцяці быў вельмі пазітыўны сцэнарый, педагог можа ўсё зламаць, уключаючы самаацэнку дзіцяці, прычым так, што потым ужо ні псіхолаг, ні псіхатэрапеўт яму не дапамогуць.

Таму ад таго, як сёння будуць вучыць дзяцей у школе, што, як і калі будуць ацэньваць, залежыць, якімі яны будуць заўтра. Упэўненымі ў сабе, творчымі, адкрытымі або выйдуць закамплексаванымі і безыніцыятыўнымі, з ярлыком няўдачніка. У якасці альтэрнатывы педагогі прапануюць адмовіцца ад выстаўлення бягучых адзнак і пакінуць толькі тэматычны і выніковы кантроль, каб спачатку даць дзецям час навучыцца, а ўжо затым экзаменаваць іх веды...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 23 апреля 2015 года в 10.00
по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.
Организатором аукциона является

республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,
находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

1. Помещения №№16-19, арендуемой площадью 33,2 кв.м, на первом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 846 600 рублей; размер задатка – 84 600 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины (по состоянию на 21 марта 2015 года составляет 306 000 белорусских рублей).

2. Помещение №317, арендуемой площадью 23,7 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 604 350 рублей; размер задатка – 60 400 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины (по состоянию на 21 марта 2015 года составляет 306 000 белорусских рублей).

3. Помещение №326, арендуемой площадью 35,4 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 902 700 рублей; размер задатка – 90 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины (по состоянию на 21 марта 2015 года составляет 306 000 белорусских рублей).

4. Помещение №521, арендуемой площадью 23,8 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 606 900 рублей; размер задатка – 60 600 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины (по состоянию на 21 марта 2015 года составляет 306 000 белорусских рублей).

Документы на участие в аукционе принимаются с 23 марта 2015 года по 21 апреля 2015 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232.

Документы, поданные после 16.00 21 апреля 2015 года, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000

■ Памяць і боль

І ПРАЗ ВЯКІ НЕ БУДЗЕ АПРАЎДАННЯ

Заўтра споўніцца 72 гады хатынскай трагедыі

Здаецца, пра Хатынь ведаюць усе — столькі было публікацый і сюжэтаў на гэтую тэму. Сёння ўжо можна па гадзінах у храналагічнай паслядоўнасці аднавіць увесь дзень 22 сакавіка 1943 года. Але з кожным разам усплываюць усё новыя дэталі...

Гэта было ў панядзелак, якраз на рэлігійнае свята Сарака пакутнікаў. Як потым аказалася, пакутнікаў у той дзень было значна больш. Напярэдадні ў Хатынь прыйшлі партызаны з атрада «Мсцівец» брыгады дзядзькі Васі (маёра Варанянскага). Пераначаваўшы ў вёсцы, раніцай яны пайшлі на заданне: трэбы было абарваць тэлефонную сувязь і зрабіць у тым месцы засаду на нямецкую рамонтную каманду. Замаскіраваўшыся, сталі чакаць немцаў.

У гэты ж час, прыкладна каля 9 гадзін, на дарогу выйшлі каля сарака сялян з суседніх Казыроў. Па загадзе немцаў яны расчышчалі лес уздоўж дарогі Лагойск — Плешчаніцы. Некалькі чалавек ад кожнай сям'і — іначай расстрэл. Засада знаходзілася ад іх прыкладна за паўкіламетра.

Тым часам на аднаўленне тэлефоннай сувязі з Плешчаніц на дзвюх грузавых машынах выехалі два ўзводы 1-й роты 118-га ўкраінскага батальёна. Разам з імі на легкавой машыне ехаў камандзір роты хаўптман (капітан) Ганс Вёльке. У Германіі яго ведалі як алімпійскага чэмпіёна па штурханні ядра 1936 года. Перад вёскай Губа легкавая машына адарвалася ад іншых і трапіла пад абстрэл партызан. Вёльке загадаў спыніцца: ён быў паранены ў руку. Паліцэйскія выскачылі з машыны, заляглі за калёсамі і адкрылі агонь у адказ па партызанах. А Вёльке пабег па полі, спрабуючы выцягнуць пісталет з кабуры. У гэты момант яго дагнала партызанская куля.

Колькі было партызан у засадзе? У данясенні атрада «Мсцівец» гаворыцца, што дзве роты. У роце, у тым ліку партызанскай, было прыкладна 80 — 100 чалавек. Нават калі дапусціць, што яны былі няпоўныя, гэта нямала. Прычым у роце павінны былі быць 2 — 3 ручныя кулямёты. А засада, па сведчанні асуджаных карнікаў са 118-га батальёна, знаходзілася на адлегласці каля 30 метраў ад шашы. Можна ўявіць, што было б з нямецкай калонай ад удару такой колькасці партызан з кулямётамі! Таму наўрад ці іх там было столькі. Чалавек каля 15, не больш. Да месца нападу пад'ехала машына з салдатамі 118-га ўкраінскага батальёна, якія пачалі адстрэльвацца. Партызаны сталі адыходзіць у бок Хатыні. Бой заціх. Было забіта двое паліцэйскіх. Гэта адбылося каля адзінаццаці раніцы.

Лічыцца, што пралогам трагедыі ў Хатыні былі менавіта гэтыя падзеі на шашы. Але яшчэ раней там адбыўся яшчэ адзін выпадак, які стаў фатальным для казырскіх сялян і паўплываў на лёс Хатыні. За некалькі дзён да трагедыі ў гэтым жа месцы партызаны зрабілі засаду на нямецкі патруль. Нападзенне якраз і стала першым звяном ва ўсім ланцугу хатынскіх падзей. Гэта пацвярджае нямецкі дакумент таго часу, у якім гаворыцца пра бой.

З аператыўнага данясення жандарскага паста ў Плешчаніцах 20 сакавіка 1943 года: *«...19.3.43 у 5.00 на дарогу ў Лагойск быў накіраваны дазор у складзе 5 жандараў, 20 паліцыянтаў і 20 салдат 118-га ўкраінскага батальёна для забеспячэння аховы суправаджэння на гэтым участку. Калі дазор у 7.30 прайшоў прыблізна 200 м за вёску Губа (кв. 2260), ён быў нечакана абстраляны з дзвюх высотак кулямётным агнём. Вахмістр жандармерыі Яцына быў цяжка паранены ў жывот. Дазор адказаў на агонь з прыдарожных канаў, куды кінуўся хавацца. Пасля перастрэлкі на працягу прыблізна 30 хвілін бандыты спынілі агонь і збеглі...»*

Думаецца, што менавіта пасля гэтага нападзення партызан на патруль немцы і загадалі жыхарам Казыроў высякаць лес на 100 метраў ад дарогі ўздоўж шашы. Праз дзень гітлераўцы ў данясенні паведамілі што *«...паранены 19 сакавіка 1943 года вахмістр жандармерыі рэзерву Яцына 20.3.1943 памёр ад ран у лазарэце СС у Мінску»*.

За некалькі дзён да трагедыі ў гэтым жа месцы партызаны зрабілі засаду на нямецкі патруль. Нападзенне якраз і стала першым звяном ва ўсім ланцугу хатынскіх падзей.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА (ЗДАНИЯ, ДВОРОВЫЕ СООРУЖЕНИЯ, СЕТИ, КАБЕЛИ, ОБОРУДОВАНИЕ КОТЕЛЬНОЙ И ТРАНСФОРМАТОРНОЙ ПОДСТАНЦИИ)

ОАО «СУКНО», расположенного по адресу: г. Минск, ул. К. Цеткин, 3,5,7.

Земельный участок площадью 5,333 га.

Начальная цена с НДС – 151 311 016 680 бел. руб. Задаток с НДС – 10 000 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1%.

Аукцион состоится 14.04.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются Организатором аукциона по 13.04.2015 до 10.00

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.01.2015.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛСОЛОД»

Учетный номер плательщика: 200075434. Вид экономической деятельности: производство солода ячменного пивоваренного
Орган управления: КОНЦЕРН «Белгоспищепром». Единица измерения: млн руб. Адрес: 225793, ул. Полевая, 32, г. Иваново Брестской области

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2014 год

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	626 635	648 916
Нематериальные активы	120	84	24
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	463	1 012
Долгосрочные финансовые вложения	150	51 412	7 086
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**678 594**	**657 038**

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар
часопіса «Маладосць»

ВОСЬ ЯНА, ФОРМУЛА!..

Памятаеце фільм «Стракатая стужка» з серыяла пра прыгоды Шэрлака Холмса? У прыватнасці разважанні доктара Ватсана? «Кожны псіхолаг вам скажа: не верце мужу, які гаворыць кепскае пра сваю цешчу, не верце пасынку, які лаецца на сваю мачаху, не верце ўсім тым жахам, якія расказвае падчарка пра свайго айчыма». Памятаеце, якраз у гэтым месцы, на апошнім слове доктара Ватсана, у кватэру на Бейкер-стрыт, 221б увальваецца драпежнікападобны вярзіла і не надта культурна прадстаўляецца? Я, маўляў, доктар Грымбсі Ройлат са Сток-Морана, айчым адной вядомай вам асобы... Ён так прамаўляе гэта «са Сток-Морана», што хочацца з утульнай канапы разам з пледам перамясціцца адразу ў Сток-Моран. Ну, хаця б таму, што ў гэты самы момант там няма Грымбсі Ройлата. Памятаеце выраз твару доктара Ватсана пасля яго з'яўлення? Ватсан, як заўсёды, памыліўся ў сваіх разважаннях. Бо калі б сказаў іначай, то меў бы рацыю. Іначай — гэта хаця б вось так: «Не верце сваякам, якія запэўніваюць, што ніколі не сварацца».

Такіх мужоў і жонак шмат. Яны так пераканаўча, з такімі інфантыльна-анёльскімі выразамі сваіх сталых і стомленых твараў даводзяць зацікаўлена-замілаваным суразмоўцам пра тое, як пражылі «душа ў душу», прайшлі па жыцці «рука аб руку» — і ніколі (за пяць даўжэзных дзясяткаў разнастайных, паўнюткіх на падзеі гадоў — ніколі?!) ні на каліўца не пасварыліся. Казачнікі!

Мой асабісты досвед сведчыць якраз пра адваротнае. Мне не трэба нават выходзіць з пад'езда, каб абвергнуць гэтую «формулу шчасця». Ды што там з пад'езда — нават з кватэры можна носа не паказваць. З канапы не ўставаць, з-пад пледа не вылазіць — і, папіваючы распушчальную каву, варажыць на суседскае заўтра.

Возьмем суседзяў зверху. Там заўсёды цішыня. Яны ніколі не сварыліся, а потым — бац! — развяліся. А вось суседзі злева. Чуеце? Зноў сварацца! Сварацца на прамілы Бог, удзень і ўначы — і ніякі развод іх не бярэ.

Мне мой псіхолаг неяк аднойчы давала параду: «Каб у сям'і быў лад, трэба ладзіць у ёй сваркі. Дазіравана. Калі занадта доўга ўсё ціха-мірна, то сварку трэба арганізаваць спецыяльна». Ну, у мяне да «спецыяльна» яшчэ ніколі не даходзіла. І дзякуй Богу.

Вось! Вось яна, формула сапраўднага сямейнага шчасця! Людзі сварацца, калі яны адно да аднаго не абыякавыя. Ну, або так: калі людзі адно да аднаго абыякавыя, яны не сварацца. Гэта чыстая праўда! Навошта, сапраўды, мне сварыцца з кабетай, якая, гэтаксама як і я, стаіць на прыпынку ў чаканні трамвая? Паедзем мы разам, але пры гэтым кожная сваёй дарогай. А вось калі яна сваім спічастым абцасам наступіць мне на мезенец...

«Большасці людзей патрэбен канфлікт, каб было проста цікава жыць». Гэта ўжо мая любімая Юлія Высоцкая сказала. Люблю, калі яна ў сваёй кулінарнай перадачы «жэніць» агрэставы мус з бульбяною кулябякай. І яна гэта сказала не пра кабет, якія наступаюць сваімі абцасамі на чужыя мезенцы. Яна гэта сказала пра мужчыну з жанчынай, якія адно аднаму муж і жонка. Бо калі вам нецікава разам, то навошта жыць пад адным дахам? А калі вы жывяце пад адным дахам, то чаму б вам хоць зрэдку не пасварыцца? Хаця б дзеля прыемнасцей прымірэння.

А тыя казачнікі, што так пераканаўча даводзяць пра даўжэзнае жыццё «душа ў душу»... У іх проста не было суседкі з добрым слыхам.

■ Гісторыя з канверта

САМ СЯБЕ «ЗВОЛЬНІЎ»...

Яе тэлефанаванне было быццам з далёкага мінулага. Так-так, я памятаў гэты лагодны, ціхі голас... Яна, Таня, засталася працаваць у калектыве, які я пакінуў, са смакам грукнуўшы дзвярыма. Час паказаў: звальненне — правільны крок, бо мая цяперашняя фірма больш паспяховая і перспектыўная, а яны засталіся ў той паміраючай канторцы з дрымучым дырэктарам, што забыўся, якое стагоддзе за вокнамі.

І вось гэтая канторка «ляснулася». Таня засталася, можна сказаць, на вуліцы. Ёй крыху за 40 гадоў, у разводзе, жыве з матуляй, дзеці амаль дарослыя...

Сутнасць тэлефанавання: дапамажы працаўладкавацца. Спецыяльнасць вузкапрофільная, такая больш не запатрабавана нідзе, толькі ў нашай фірме. Інакш прыйдзецца ісці працаваць гандляркай на вуліцу.

А чаму не дапамагчы гэтай зеленавокай? Яна мне і тады, шэсць гадоў таму, падабалася, але мяне на той момант турбавалі іншыя жарсці... А вось зараз, калі ў жыцці пустыня... Але ж у нашай фірме вакансій няма: на месцы, куды можна было б пасадзіць Таню, — пенсіянерка, якая, так бы мовіць, зубамі ў яго «ўгрызлася».

Я не кіраўнік фірмы, але да майго меркавання прыслухваюцца, не шэры кардынал, але мяне нават трохі пабойваюцца. Я накіраваўся да шэфа. Ён мямліў штосьці невыразнае, але я патлумачыў: спецыяліст такога профілю на дарозе не валяецца. Мы можам узяць яе пакуль на сумежную пасаду, бо пенсіянерка ўсё роўна нас пакіне, здароўе яе «гарэзіць» — цукровы дыябет і іншыя праблемы. Шэф здаўся, і з 1 верасня Танечка выйшла на работу.

І тут я «прыўдарыў» за ёй. Мае заляцанні былі доўгімі, але яе ўспыхваючыя вочкі дарылі надзею. Я не быў безнадзейным кавалерам: надышоў час, і каханне нас зрэзала напавал.

Але — быт. Але — немагчымасць сустрэч «на шырокую нагу» ў маленькім райцэнтры, усё мімалётна, усё спехам. Прыкра, але нашай «спальняй» часцей за ўсё станавіўся аўтамабіль — малапрыдатнае месца для спатканняў. Дадайце сюды святую неабходнасць сядзець вечарам дома (я жанаты чалавек). У прынцыпе, мне было зручна, мяне ўсё задавальняла. Хаця аскетызм і сціпласць Таццяны здзіўлялі: гэткая палюбоўніца эканомкласа... Памятаю яе папярэдніц: тыя і не хавалі рублёвага інтарэсу. Я палічыў, што Танька проста ўдзячная мне за тое, што дапамог знайсці добрае месца працы, калі яна апынулася амаль на вуліцы.

Карацей, мне было лёгка, прыемна і весела. Я амаль ні пра што не думаў.

Але праз два гады на гэтым «гарызонце» з'явіліся хмары. Заўважыў, што Таня не так туліцца, нават пазбягае мяне. Стала яршыстай. Раптам выстраліла пытаннем: а як я адрэагую, калі яна выйдзе замуж? Тым больш што ў нашых адносінах ніякага прагрэсу.

Пасыпаліся адмовы на мае просьбы аб спатканні. Яна стала закрытай, негаваркой. Я ўключыў усе свае ўнутраныя рэзервы — і ўбачыў, што яны не дзейнічаюць, мае запозненыя падарункі яе таксама не краналі!

Тое, што, як я лічыў, мне належала, насамрэч мне зусім не належала!..

Аднойчы ўбачыў, як яна садзіцца ў аўтамабіль да незнаёмца. Скажу шчыра: гэта быў адзін з самых непрыемных момантаў у маім жыцці. Але што я, жанаты мужчына, мог зрабіць?

Насталі змрочныя, халодныя дні... Наваліліся бяссонніца, цяжкія думкі. Аказваецца, я, сам таго не заўважаючы, быў моцна прывязаны да яе. Здаецца, за адно спатканне з ёй аддаў бы палову жыцця, хаця яшчэ паўгода таму пра гэта не думаў. Мяне перасталі цікавіць іншыя жанчыны. І бачу, што яны нічым не горшыя за Таню, але думкі толькі пра яе...

А як нервуюць яе бясконцыя размовы па тэлефоне — з ім, з кім жа яшчэ. З якім шчаслівым

выразам твару яна крочыць па калідоры! А вось мне яна так часта не тэлефанавала, са мной столькі не размаўляла... Калі бачу яе, радасную і чужую, то пасля палову дня не магу прыйсці ў сябе.

— Што з табою? — здзіўляецца шэф. — Дзе новыя ідэі, дзе прапановы? Твая працаздольнасць знізілася ў разы!

Я ведаю, што са мной. Я ўжо напісаў заяву аб звальненні. Перачытаў, задумаўся: якімі парадоксамі напоўнена жыццё! Пасля таго, як «узяў» Таню на работу, я «звольніў» самога сябе. Не магу спакойна глядзець на яе шчасце...

Г.А.,

Брэсцкая вобласць

■

■ Паміж намі

Мелодыя даждж у

...Мяккае «дзынь» нябачнага званочка над уваходам ненавязліва паведамляе публіцы пра іх з'яўленне. Вось удача — любімы столік у кутку ля акна аказваецца незанятым. Яна падыходзіць да яго, нячутна ступаючы па мяккім дыване — праз вячэрні паўзмрок маленькай залы, праз мімалётныя ацэньваючыя позіркі. Ён ледзь прыкметна падтрымлівае яе, злёгку дакранаючыся да рукі...

Як толькі яны займаюць месца ў сваёй «бухце» — столікі адмяжоўваюцца адзін ад аднаго невысокімі перагародкамі — ад цёмна-зялёнай парцьеры аддзяляецца ў чымсьці чорна-белым афіцыянт і плыве па праходзе... Праз паўхвіліны ён ужо нахіляецца над іх столікам, пытаючыся: «Вам як заўсёды?»

Яны адначасова ківаюць галовамі ў знак згоды і ўсміхаюцца. Трэба ж — «як заўсёды»! Гэтую кавярню яны і наведвалі ўсяго разы са тры, звычайна тады, калі надвор'е было мярзотнае, а разбегчыся ў розныя бакі не хапала сіл. Прыкладна як сёння...

Недзе там, за акном (ці ў іншым вымярэнні), бясконцым патокам льецца з неба вада. Горад хутаецца ў плашчы, хаваецца пад парасоны і патанае ў шэрых рэках. На вуліцах гаспадарыць вецер, шпурляючы ў твары прахожых прыгаршчы халодных кропель...

А тут усё па-іншаму. Утульна і ненавязліва. Яна непрыкметна скідвае пад сталом абодва туфлікі і апускае ногі на мяккі дыван. Дзякуй Богу, можна расслабіцца, а ўсім астатнім няма да іх ніякай справы...

«Вунь там, —думае яна, — за столікам насупраць сядзяць тры жанчыны. На іх твары накладзена столькі грыму,

што яны страцілі жывасць і здольнасць выяўляць эмоцыі... П'юць дарагое віно, кураць дарагія цыгарэты. І робяць выгляд, што іх абсалютна не хвалюе ўсё, што адбываецца навокал. Але кожная напружана чакае. Таго, з кім можна было б правесці астатак жыцця, ці некалькі месяцаў, ці хаця б ноч... Цудоўна разумеючы, што ёсць нешта відавочна прыніжальнае ў гэтым завуалявана-красамоўным чаканні...»

А яшчэ яна думае пра сваю перавагу над імі — ёй нікога не трэба чакаць. Яна нават калі і чакае, то з упэўненасцю, што прыйдуць.

...У зале зайграў аркестр. Дакладней, невялікі аркестрык. Уласна кажучы, з-за яго яны і выбралі гэтае месца. Першым разам зайшлі выпадкова, пачулі — і жывая музыка прываражыла чароўнымі гукамі. А можа, ім толькі здаецца, што чароўнымі?.. Можа, насамрэч музыкі іграюць бяздарна і менавіта з гэтай прычыны іх даўно не запрашалі на прэстыжныя выступленні ў вялікія залы. І яны — ад безвыходнасці і безграшоўя — падаліся забаўляць шчымлівымі рамансамі неперабораліваю і непатрабавальную публіку...

Мужчына бярэ руку жанчыны ў сваю і пяшчотна, ледзь кранаючы, перабірае яе пальцы. «Гэта мы ці не мы? — думае яна. — Мы ёсць ці нам гэта толькі здаецца?»

Аркестр змяняе рэпертуар і манеру ігры — у музыцы ўжо няма надрыву. Чароўныя гукі льюцца не інакш як з самых патаемных глыбінь скрыпічнай душы і адлятаюць пад столь, каб змяшацца там з цыгарэтным дымам і вінным пахам.

Круціцца галава...

«Так?» — пытаюцца яе вочы.

«Так, так, так, тысячу разоў так!» — адказвае яго погляд.

«Вельмі?» — удакладняюць яе напаўраскрытыя вусны.

«І нават яшчэ больш!» — сцвярджаюць яго цёплыя далоні і нецярплівыя пальцы.

Адна з трох жанчын за суседнім столікам паварочваецца і доўга глядзіць на іх, ляніва пацягваючы з бакала чырвонабарвовую вадкасць.

Яна бянтэжыцца і аднімае руку.

— Гэта твая знаёмая? — пытаецца ў яго. — Увесь час сюды глядзіць.

— Супакойся, яна проста нам зайздросціць.

— А ёсць чаму?

— І ты яшчэ сумняваешся?..

Ён заўважае, што яна зняла туфлі. Знарок скідвае на падлогу сурвэтку і нахіляецца, каб падняць. Кончыкамі пальцаў праводзіць па маленькай вузкай ступні...

— Не трэба, нам пара ісці. Дождж, напэўна, ужо скончыўся.

...За спінай растваряецца шчымлівая мелодыя, гукі яе ўсё больш аддаляюцца, і скрыпка спявае і плача ўжо для кагосьці іншага.

А дождж не скончыўся — толькі крыху зменшыўся. Узяўшыся за рукі, яны бягуць да прыпынку... «Пакуль!» — крычыць яна, ускокваючы на падножку перапоўненага тралейбуса. Праціскаецца на заднюю пляцоўку і з замiраючым сэрцам глядзіць на гадзіннік. Ён паказвае пачатак восьмай. У-фф... Адлягло... «Яшчэ паспею праверыць урокі ў Волечкі і прыгатаваць вячэру мужу, трэба толькі выйсці на прыпынак раней, каб забегчы ў краму».

«Асцярожна, — папярэджвае вадзіцель, — дзверы зачыняюцца...»

Ала БЫВАЛАВА

■

А мужчыны спяць больш...

За 100 гадоў гісторыі існавання міжнароднага свята 8 Сакавіка жанчыны дабіліся важкіх поспехаў, але многія праблемы так і застаюцца нявырашанымі. Гендарныя стэрэатыпы перашкаджаюць многім жанчынам рэалізаваць сябе ў грамадстве, адчуваць сябе ўпэўненымі і абароненымі, адзначае Фонд ААН у галіне народанасельніцтва.

У краіне на 1 студзеня пражывалі 5 072 тыс. жанчын, або 53% агульнай колькасці насельніцтва. Прычым у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу — 78% жанчын, у сельскіх населеных пунктах — 22%.

● Жанчыны ў Беларусі маюць больш высокі ўзровень адукацыі, але занятыя ў прафесіях і галінах, якія найменш аплачваюцца.

● Суадносіны налічанай сярэднямесячнай зарплаты жанчын да заработнай платы мужчын складаюць каля 75%.

● На вольны час у мужчын застаецца каля 40 хвілін у будны дзень, у жанчын — 28. На чытанне газет, часопісаў, інтэрнэт і тэлебачанне мужчыны трацяць 2 гадзіны 12 хвілін за дзень, жанчыны — 1 гадзіну 9 хвілін. У сярэднім мужчыны спяць 8 гадзін 27 хвілін, жанчыны — 8 гадзін 2 хвіліны.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Парады дамы

У ЧЫМ СІЛА, БРАТ?

Наташа пазнаёмілася з будучым мужам падчас юбілейнай сустрэчы з аднакласнікамі. Споўнілася 10 гадоў, як яны скончылі школу, таму вырашылі адзначыць гэта на дачы ў Барыса, хлопца з іх класа. Там Наталля і ўбачыла Улада, яго малодшага брата. Убачыла і здзівілася: дзе яе вочы былі раней, чаму ў школе яна не заўважала такога прыгожага хлопца?..

Пасля вечарыны яны сталі тэлефанаваць адно аднаму, сустракацца. А праз паўгода Улад зрабіў ёй афіцыйную прапанову рукі і сэрца. Наталля пагадзілася адразу: па-першае, хлопец ёй падабаўся, а па-другое, яна добра ведала яго старэйшага брата. Барыс заўсёды быў вельмі сур'ёзны, самастойны, адказны і працавіты. Адзіны з тых, хто нават у апошнім класе рабіў усе хатнія заданні і ў каго можна было спісаць на ўроку, надзейны таварыш ва ўсіх справах...

Якое ж было здзіўленне, калі ўсяго праз некалькі месяцаў яна зразумела: Улад — поўная супрацьлегласць старэйшага брата. Легкадумны, бязладны, гультаяваты, ні на што не здатны ні ў хатніх, ні, тым больш, у сур'ёзных жыццёвых справах.

Закаханасць змянілася расчараваннем. Усё часцей Наталля пачала задумвацца пра тое, што памылілася, аддаўшы перавагу Уладу...

А цяпер узгадаем казку пра тое, як у аднаго бацькі было тры сыны: старэйшы — разумны, другі — ні тое, ні сёе, а трэці, малодшы, — дурань дурнем... У гэтай казцы вельмі дакладна і яскрава даецца характарыстыка тром тыпам мужчын.

Старэйшы брат — і сапраўды часта самы разумны. І не толькі сярод сваіх братоў і сясцёр, але і сярод калег. Ён з дзяцінства быў аўтарытэтам для малодшых, прызвычаіўся іх апекаваць, абараняць, адказваць за іх перад бацькамі. Таму ён умее і вогнішча распаліць, і суп зварыць... Свае адказнасць і клопат ён звычайна пераносіць на сяброў, аднакласнікаў, калег, а з цягам часу — і на бацькоў, асабліва састарэлых. Старэйшы брат прывучаны працаваць з малых гадоў, ён старанна вучыцца ў школе, а потым добрасумленна і мэтанакіравана працуе. Старэйшы часцей за іншых братоў робіць поспехі ў кар'еры. Дома ён — гаспадарлівы і клапатлівы муж, тата і сын, які добра разумее сваё прызначэнне — забяспечваць і абараняць. Гэта менавіта той мужчына, пра якога гавораць: «За мужам — як за мураванай сцяной».

Сярэдні брат — так сабе... Але толькі на першы погляд. З «сярэдніх» атрымліваюцца досыць таленавітыя і паспяховыя людзі, бо сярэдні ўсё сваё дзяцінства саперничае са старэйшым за першынство. Апроч таго, у сярэдняга брата характар звычайна больш падатлівы: ён не прызвычаіўся камандаваць і чытаць маралі, як старэйшы, умее дамаўляцца. Ён пастаянна імкнецца да лідарства і не любіць падпарадкоўвацца, таму ў дарослым жыцці стараецца выбраць працу, дзе будзе сам сабе гаспадар. Менавіта з гэтай кагорты выходзіць шмат дзелавых людзей... Дарэчы, для сямейнага жыцця такія мужчыны — проста знаходка. У іх не бывае крайнасцяў у характары. З імі лёгка знайсці агульную мову.

Малодшы — звычайна ўсеагульны любімчык, нярэдка — пястунчык. Ён прывыкае да гэтай ролі і стараецца быць у ёй усё жыццё. З маленства ён агорнуты любоўю і клопатам не толькі бацькоў, але і старэйшых братоў і сясцёр. Яму даруюць тое, што не даруюць іншым. Таму малодшы прывыкае ў цяжкіх сітуацыях хавацца за спіны старэйшых і ні за што не адказваць. Прывычка пераўтвараецца ў рысу характару, і ў рэшце рэшт вырастае чалавек, які легкадумна ставіцца да праблем і ў сям'і, і на працы, і ў жыцці наогул. Малодшанькія не прывыклі напружвацца, браць на сябе адказнасць, пераадольваць цяжкасці, таму і кар'еру зрабіць ім складана. Затое яны часта бываюць душой калектыву. Малодшыя браты — звычайна вельмі камунікабельныя. З маленства яны прывыклі пазбягаць канфліктаў са старэйшымі, больш моцнымі фізічна, навучыліся гасіць спрэчкі мілымі ўсмешкамі, апраўданнямі і адгаворкамі... Жыць з такім мужчынам цяжкавата. Прыйдзецца ўзяць на сябе ролю «мамачкі» — усе важныя рашэнні прымаць самой: рабіць рамонт, выхоўваць дзяцей, а за адным разам — і мужа. А яшчэ прыйдзецца цярпець яго вясёлыя кампаніі, сяброў і, не выключана, сябровак...

Тамара БУНТА

■

■ Тэст

Камандзір, «ікона» ці сяброўка?

Даведайцеся, хто вы ёсць на самой справе

Усе жанчыны мараць пра тое, каб сустрэць свайго адзінага і пабудаваць з ім трывалыя адносіны. А ці добра вы можаце ладзіць са сваёй другой «палавінкай»? Прайдзіце тэст, каб даведацца, якая вы жонка (або якой станеце ў будучыні)? Спатрэбяцца папера і ручка, каб запісаць, якіх адказаў у вас больш: А, Б, В або Г.

Хто звычайна засцілае ложак?

А) Гэты абавязак замацаваны за мужам.

Б) Ніхто не засцілае.

В) Гэта абавязак жанчыны.

Г) Той з сужэнцаў, хто пазней адыходзіць на працу.

Як вы адзначаеце гадавіну вяселля?

А) Віншуем адно аднаго на словах.

Б) Заказваем столік на дваіх у нашай любімай кавярні.

В) Я сервірую вячэру з яго любімых страў.

Г) Муж дорыць кветкі, а я купляю торт у выглядзе сэрца.

Ідэальны мужчына — гэта...

А) Універсальны баец.

Б) Мільянер, а лепш мільярдэр.

В) Надзейны сем'янін.

Г) Разумны чалавек.

Ваш любімы хатні ўбор:

А) Трыкатажныя штаны і ўтульны світар.

Б) Набытыя некалькі гадоў таму сукенкі, якія ўжо не надзенеш «у людзі».

В) Яркі халацік, піжама «з мішкамі», мяккія тапачкі.

Г) Джынсы і футболка.

Калі ў ваннай падцякае кран:

А) Скажу мужу, каб вечарам абавязкова паправіў.

Б) Буду кожны дзень гаварыць мужу пра гэта да таго часу, пакуль ён не вырашыць праблему.

В) Выклічу сантэхніка, каб не турбаваць мужа.

Г) Папрашу мужа адрамантаваць, а калі ён не зможа, паклічам спецыяліста.

Хто ў адказе за сямейны бюджэт?

А) Сямейны бюджэт ляжыць на маіх плячах.

Б) Я раблю свой унёсак, але большая частка даходаў — заслуга мужа.

В) За даходы ў нашай сям'і цалкам адказвае муж.

Г) Дзелім усе выдаткі пароўну.

Ранішні секс у будні...

А) Дапамагае ўзбадзёрыцца перад доўгім працоўным днём.

Б) Хіба тады, калі мы абое зможам прачнуцца раней.

В) Калі муж праяўляе ініцыятыву, я не супраць.

Г) Уносіць разнастайнасць у наша сямейнае жыццё.

На вечарынцы муж ажыўлена гутарыць з маладой сімпатычнай незнаёмкай. Вашы дзеянні?

А) Падыду і далучуся да размовы, каб ён нас пазнаёміў.

Б) Адвяду яго ўбок і пачну высвятляць адносіны.

В) Прамаўчу або паспрабую выклікаць у яго рэўнасць.

Г) Не звярну ўвагі — я ўпэўнена ў сваім мужу.

Вы хочаце завесці хатняга гадаванца, але муж супраць:

А) Яму прыйдзецца змірыцца з маім рашэннем.

Б) Паспрабую яго пераканаць.

В) Задумаюся над яго словамі або збяру сямейную раду.

Г) Паспрабую знайсці кампраміснае рашэнне.

Што ў вас запланавана на найбліжэйшыя выхадныя:

А) Я патрачу іх на сябе.

Б) Буду гуляць па гандлёвым цэнтры з мужам.

В) Прысвячу час сям'і.

Г) Мы з мужам ідзём у госці.

КАЛІ Ў ВАС БОЛЬШ АДКАЗАЎ «А», ВЫ:

Жонка-камандзір

Вы суткі на працы або на мерапрыемствах, а таму лічыце за найлепшае раздаваць каштоўныя ўказанні дамашнім па тэлефоне, абеды і вячэры гатуеце на некалькі дзён наперад, а праверку хатніх заданняў у дзяцей перадаручаеце мужу ці бабулі. Вы заўсёды ведаеце адказы на ўсе пытанні, лёгка спраўляецеся з любымі цяжкасцямі: высвятленне адносінаў з шумнымі суседзямі, аплата рахункаў у банку або выклік майстра, каб адрамантаваць кран у ваннай. Узяўшы на сябе большую частку хатніх абавязкаў, вы па праве патрабуеце ад мужа беспярэчнага падпарадкавання, — і, калі разгарыцца канфлікт, абавязкова нагадаеце пра ўсе свае заслугі. Можа, дома вам варта прымераць на сябе ролю слабай жанчыны, каб ваш муж мог клапаціцца пра сваю далікатную і безабаронную другую «палавінку». Раптам вам гэта спадабаецца?

КАЛІ Ў ВАС БОЛЬШ АДКАЗАЎ «Б», ВЫ:

Сварлівая жонка

Вы ведаеце сабе цану і прывыклі заваёўваць перамогу над мужам любым спосабам, атрымліваючы жаданае чаго б гэта ні каштавала, нават калі пад пагрозай — вашы адносіны. Сямейнае жыццё зводзіцца для вас да пастаянных спрэчак, скандалаў і прэтэнзій да мужа, які своечасова не прынёс заробак, не адрамантаваў свяцільню, азірнуўся на жанчыну, якая праходзіла міма, або неяк не так паглядзеў на вас. Паспрабуйце стаць крыху мякчэйшай і навучыцеся ісці на кампраміс. Бясконцыя пошукі вінаватых могуць надакучыць каму заўгодна і разбурыць нават самы моцны шлюб.

КАЛІ Ў ВАС БОЛЬШ АДКАЗАЎ «В», ВЫ:

Ікона дамастрою

Як сапраўдная жанчына, вы прывыклі аддаваць права голасу моцнаму полу і чакаеце дапамогі ад мужа ва ўсім, што датычыцца фінансавых пытанняў. Разам з адказнасцю за сямейны бюджэт вы даяце мужу поўную свабоду, цалкам прысвячаеце сябе вядзенню гаспадаркі, часам ахвяруючы ўласнымі інтарэсамі, зносінамі з сяброўкамі або нават магчымасцю зарабіць кар'еру. Вы гатовы безагаворачна прыняць пункт гледжання мужчыны, толькі б не турбаваць яго па дробязях, умееце дыпламатычна прамаўчаць або саступіць у спрэчцы, нават калі прыйдзецца правесці найбліжэйшы водпуск з мужам у гарах, а не дома ў коле сяброў. Але... выказаць уласную думку — зусім не азначае яе навязаць, можа, лепш павучыцца шукаць адказы на пытанні ўдваіх?

КАЛІ Ў ВАС БОЛЬШ АДКАЗАЎ «Г», ВЫ:

Баявая сяброўка

Наўрад ці такія адносіны могуць надакучыць, паколькі вы даўно навучыліся ісці ў нагу з мужам і, як сапраўдныя закаханыя, глядзіце не адно на аднаго, а ў адным кірунку, храбра дзеліце не толькі радасці, але і беды. Вы тактоўная і жаноцкая, але ў той жа час заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу і падтрымаць мужа ў цяжкую хвіліну, прычым не толькі словам ці карыснай парадай, але і справай. Вы ўмееце адстойваць інтарэсы сваёй сям'і перад сваякамі, калі яны не жадаюць ісці на кампраміс, а замест дарагіх падарункаў нярэдка аддаяце перавагу палкім прызнанням у каханні і простым знакам увагі. Што ж, пра такую жонку, як вы, можна толькі марыць!

Вера ФЕМІНА

■

Наш культурны асяродак
Жыр-андоля
Выпуск № 10 (267)

■ Да Сусветнага дня паэзіі

З ДУДКАЮ ПРАЗ СТАГОДДЗІ

Вецер дзьме і вые,
Што аж мыслі рвуцца,
Змоўклі песні тые,
Што іграў на дудцы.
Раз яшчэ зайграю
У астатняй хвілі
Для тых, што жаль маю,
Што мяне забылі...
Ф. Багушэвіч.

Відаць, ведалі ў ЮНЕСКА пра «краіну паэтаў», калі ў 1999 годзе зацвердзілі новае свята. Сусветны дзень паэзіі можна лічыць святам Беларусі — «краіны паэтаў». Не толькі таму, што наша зямля паэтаў нараджала багата. Так атрымалася, што 21 сакавіка, калі адзначаецца свята, супадае з Днём нараджэння аднаго з выдатных паэтаў Беларусі XIX стагоддзя — Францішка Багушэвіча, які ўсім сваім жыццём і творчасцю зацвердзіў: ёсць беларуская літаратура. А сёлета Сусветны дзень паэзіі супадае яшчэ і са 175-й гадавінай паэта Багушэвіча.

«Паэзія можа стаць адказам на самыя вострыя і глыбокія духоўныя пытанні сучаснага чалавека», — палічылі ў ЮНЕСКА. А наш Багушэвіч ведаў пра гэта ад пачатку, калі толькі зразумеў, як можна распараджацца словам, каб і сэнс быў, і карысць для іншых.

Гэта сёння мы чамусьці падзяляем людзей на «фізікаў» і «лірыкаў». Можа быць, у Беларусі гэтая формула не працуе: тут кожны лірык па-свойму. Прынамсі Багушэвіч і дапамагае абвергнуць сучасны стэрэатып: паступаў вучыцца ён на фізіка-матэматычны факультэт у Пецярбургу, працаваў следчым і адвакатам. А ў гісторыю ўвайшоў найперш як паэт, аўтар зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі», чалавек, які заклаў падмурак для нацыянальнай літаратуры. Для ўсіх тых, хто быў потым, у стагоддзі XX, якое пачыналася для нашай паэзіі з прыходам магутных творцаў. Меў рацыю паэт Алесь Гарун: тут «сам народ — пясняр».

Паэтаў і зараз у нас шмат. Але гэта, здаецца, той варыянт, калі колькасць і якасць роўныя па вартасцях і значнасці. І ёсць, безумоўна, у сучасных беларускіх паэтах нешта ад Францішка Багушэвіча: яны жывуць з гэтай творчасцю, але робяць і паспяваюць значна больш, у іх шмат спраў, клопату, у іх ёсць сэнс, у суладдзі з якім яны выбудоўваюць адносіны да жыцця і рэчаіснасці, што потым адлюстроўваецца ў іх паэзіі. Пра тое, як сумясціць творчасць з «прозай жыцця» разважалі ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча Андрэй Адамовіч, Георгій Барташ, Павел Касцюкевіч, Уладзімір Пыльчанка, Цімох Авілін, Павел Селівончык, Сяргей Башлыкевіч. Яшчэ напярэдадні свята, пра якое таксама можна сказаць: яно не толькі ў гонар паэзіі. З грэчаскай мовы слова паэзія перакладаецца як «творчасць». Таму імпрэза ў музеі прайшла з удзелам пісьменнікаў, музыкаў.

Паэзія — больш чым паэзія. Паэты — больш чым паэты... Як цудоўна, што гэты дзень выпаў на суботу, калі выхадныя дні можна сапраўды правесці паэтычна. Ёсць час схадзіць у кнігарню, падабраць сабе зборнік вершаў (ці твораў), пачытаць. Пачытаць і даведацца нешта пра тых, хто сёння ўвасабляе працяг Багушэвіча. І можна тады зразумець: у нас што ні паэт — тое асоба. Што ні асоба — тое Сусвет. Дзень паэзіі яшчэ і таму — Сусветны...

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Майстэрня

МЕТАМАРФОЗЫ АБ'ЁМАЎ

Аляксандр Малей і новыя формы супрэматызму

«Чорны квадрат» Казіміра Малевіча створаны больш за сто гадоў таму — у 1914 годзе. Сам аўтар лічыў «Чорны квадрат» «зародкам усіх мажлівасцяў», не канцом, а пачаткам новай рэальнасці. Гэты твор дасюль інтрыгуе і гісторыкаў мастацтва, мастацтвазнаўцаў, і тых, хто ніяк не звязаны з мастацтвам. Колькі гадоў таму заінтрыгаваў ён і мяне. Я зацікавілася супрэматызмам, пачынальнікам якога быў Малевіч. Дарэчы, гэты год можна лічыць юбілейным. Першыя супрэматычныя творы былі паказаны роўна 100 гадоў таму, у 1915 годзе, на выстаўцы «0,10» у Петраградзе. Казімір Малевіч распрацаваў тэорыю супрэматызму, паводле якой сцвярджалася вяршэнства абстрактнай формы, зведзенай да квадрата, круга, трохвугольніка, прамавугольніка, крыжа. У мяне, натуральна, з'явілася пытанне, а ці ёсць тыя, хто працягвае, развівае традыцыі супрэматызму, закладзеныя Малевічам? І вось на трыенале сучаснага беларускага мастацтва ў 2012 годзе я ўбачыла загадкавыя, незвычайна прывабныя творы нашага сучасніка — віцебскага мастака Аляксандра Малея. У іх ідэі супрэматызму развіваліся і на плоскасці, і ў аб'ёме. Творы Малея інтрыгавалі не менш, чым творы Малевіча.



Мастак Аляксандр Малей перакінуў мост, якім злучыў сучаснае і мінулае. У 1987 годзе мастак арганізаваў творчую групу «Квадрат», якая стала духоўнай пераймальніцай «УНОВІСА» («Сцвярджальнікаў новага мастацтва» — адметнай сістэмы навучання, суполкі, што існавала ў 1920-я гады).

Аляксандр Малей аналізуе, прапускае праз сябе ідэю супрэматызму і выдае новы, асабісты прадукт. Здабытыя веды ўступаюць у «хімічную рэакцыю» з уласным досведам. У свой час пісьменнік Мішэль Мантэнь у сваёй кнізе «Вопыты» адзначыў, што няма сэнсу ў простым збіранні ведаў, складанні іх у галаву, быццам у шафу з кнігамі, каб у выніку стаць энцыклапедыяй. Трэба ўсе веды прапусціць праз сябе і зрабіць іх сваім досведам, толькі тады будзе карысць ад спазнанага. Гэта якраз і робіць мастак Аляксандр Малей. Ён пераасэнсоўвае папярэдні вопыт Малевіча і дае свой адказ на тэму супрэматызму.

Мэта Аляксандра Малея — пераканаць гледача ў звышдухоўнасці сучаснага мастацтва. Ён заклікае людзей выйсці за звыклыя межы свядомасці, азірнуцца і адчуць вялікую, бясконцую прастору быцця.

Яго творы жывуць у дзвюх прасторах: плоскай і аб'ёмнай, прасторах духоўнага і фізічнага свету. Быццам сапраўдныя жывыя арганізмы, яны маюць знешнюю абалонку, да якой мы можам дакрануцца. Але за ёю схавана і пазарацыянальная прастора, так бы мовіць, духоўны свет.

Работы Аляксандра Малея можна параўнаць з чалавекам, пры сустрэчы з якім мы можам ацаніць яго фізічныя якасці, але яго духоўны, унутраны свет адкрыецца нам не адразу. Так і творы Аляксандра Малея не даюць нам простых, ясных адказаў. Затое ў іх ёсць прастора для роздуму, дзе ў кожнага чалавека могуць нарадзіцца свае асацыяцыі.

Што ж стварае Аляксандр Малей? Неяк ён прызнаўся, што імкнецца стварыць святыню мастацтва. Такую святыню, у якой без яўных, рэальных сімвалаў чалавек будзе разумець і адчуваць, што менавіта тут сканцэнтравана духоўнае жыццё. Адчуваць сакральнасць і глыбіню без знешняй атрыбутыкі. Вельмі проста паказаць на прыгожы барочны храм і сказаць, што гэта святыня, і большасць пагодзіцца. Але калі паказаць на чыстае поле і сказаць — гэта святыня Божая, — такое зразумее не кожны. Магутнасць, веліч нельга выказаць праз знаёмыя пластычныя формы. Веліч нельга змясціць у межы муроў — яна нябачная, яе немагчыма спасцігнуць. Гэта і ёсць асноўны тэзіс, асноўны пасыл мастака да гледача: не шукаць у творах знаёмых формаў, але абстрагавацца і ўбачыць значна болей, чым рэальны свет.

Аляксандр Малей пайшоў далей за супрэматызм. Яго творы маюць не проста геаметрычныя формы, яны, хутчэй, віхрыста-закручаныя. Яны паказваюць пульс жыцця, а не яго статыку. Формы трансфармуюцца, на нашых вачах адбываюцца метамарфозы аб'ёмаў.

У творах мастака вельмі часта выкарыстоўваецца геаметрычная фігура — круг. Круг — сімвал адзінства, бясконцасці, завершанасці і найвышэйшай дасканаласці.

Кожная яго праца — гэта космас, які заклікае нас да медытацыі і сузірання. Будуючы святыні ў сваёй душы, ён уключае ў свет сваёй творчасці ўсё новыя ідэі і памкненні.

Кацярына КРАМАРЭНКА

Кола.

■ Прэм'ера

Просты смех у спектаклі пра вайну

Як шчаўчком змяніць глядацкае ўспрыманне галоўнага персанажа

Калі-калі, а ў год сямідзесяцігоддзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай недахопу «прымеркаванага» мастацтва ў беларускім культурным асяродку быць не можа. Тым больш што «мы толькі думаем, што вайна скончылася ў сорак пятым...» Выбітны беларускі драматург Андрэй Макаёнак тут вельмі дарэчы. Яго спадчыну, трагікамедыйную п'есу «Трыбунал», выкарыстаў Новы драматычны тэатр і прадставіў аднайменны спектакль, прэм'ера якога адбылася на гэтым тыдні. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам стаў Сяргей Кулікоўскі.

Выкарыстанне прарыўной для свайго часу п'есы Андрэя Макаёнка можна лічыць сімвалічным, калі б яна ні ставілася. Таму што магчымасць смяяцца з таго, што знаходзіцца ў кантэксце сусветнай бяды, — сорт сучаснага шчасця. У той час, як тэма вайны паказвалася выключна ў драматычным, трагедыйным, батальным — адным словам, грандыёзных па напружанні — жанрах, Макаёнак лёгкай рукой напісаў трагікамедыю. Сюжэт пра быццам звычайную сялянскую сям'ю ў трыядзінстве месца, часу і дзеяння. Тое, што з ёй у гэтай складанай тэме можна разам пасмяяцца, — вельмі ўдалы аксюмаран. На ўсе часы. Адзінства месца — сялянская хата з ручнікамі, ступкамі ды гарэлкай на стале — іграе асвятленнем, снегам за дзвярыма, «Зімой» Антоніа Вівальдзі ды выверанай мізансцэнай.

У той час, як тэма вайны паказвалася выключна ў драматычным, трагедыйным, батальным — адным словам, грандыёзных па напружанні — жанрах, Макаёнак лёгкай рукой напісаў трагікамедыю.

У вячэрні спакой у хату, дзе гаспадарчымі справамі займаюцца маці Паліна (Таццяна Папова) з нявесткай, заскоквае ўзбуджаны галава сям'і — Цярэшка Калабок (у двух саставах яго іграюць Ігар Нікалаеў і Аляксандр Гусеў). Аказалася, што яго прызначылі старастам вёскі, з нагоды чаго трэба пачаставаць новых начальнікаў. У хату завальваюцца паліцай Сырадоеў і немец-камендант, перад якімі Калабок мітусіцца, апраўдваецца за звычку казаць «таварыш» і расказвае, што пры савецкай уладзе быў пастухом. Потым ён быццам п'янее, шмат гаворыць («што ў п'янага на ўме, то слова не верабей») і стварае сапраўдны вобраз маленькага чалавека, на галаву якога цудам звалілася «ганаровая» пасада. І глядач верыць у гэты вобраз, тым больш разам з сям'ёй Цярэшкі, для якой новае становішча бацькі — несусветная ганьба.

Трыбунал — насамрэч не тое, што можа ўзнікнуць у думках пры звязванні назвы спектакля (чытаць: п'есы) з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Не зброя, не агонь, не жудаснае катаванне, не фашысцкая жорсткасць, не бесчалавечая знявага. Але ўсё ж такі незвычайны паварот, дарэмнае абвінавачванне і суровы прыгавор. Прыгавор «свежаму» старасце вёскі: пасля таго, як прыйдзе цемра, кінуць яго ў ваду. Хто прысудзіў? — жонка з дзецьмі, трыма з дванаццаці, ды нявесткай.

Сыны Цярэшкі Калабка ваююць на фронце, дочкі чакаюць жывых мужоў, малодшы сын Валодзька — імпульсіўны, эмацыянальны і моцны духам — хавае зброю ў патайным месцы, поўніцца нянавісцю да фашыстаў і, як глядач пачынае падазраваць з пачатку спектакля, становіцца галоўным трагічным акцэнтам пастаноўкі. У такой сям'і здраднік выглядае дзіўна.

Дарэчы, хочацца адзначыць падбор акцёраў, напрыклад, на ролю мужнага Валодзькі: Павел Чарноў паказаў хлапечую далікатнасць, крохкасць і жаласлівасць, што разам з кранальным заіканнем прыгожа дысануе з гучнымі заявамі і рашучасцю персанажа.

Мнагазначна абыграны і вобраз каменданта, створаны Сяргеем Тоўсцікавым (у першым саставе Ігарам Падлівальчавым). Ён тонка чапляе дробязямі, даючы зразумець, што ўлада, якая б яна ні была — улада. Але з яе можна пасмяяцца. З таго, як агідна камендант прыцмоквае, упэўнена закідвае нагу на стол, хоць гэта яму не патрэбна і няёмка, як недарэчна п'янее, па-дурному сябе паводзіць.

Але нічога нельга параўнаць з момантам, які мяняе асвятленне (не фізічнае, вядома ж) вобраза бацькі сям'і. Гэта сюжэтны падзел спектакля, калі ты ўсведамляеш, што падманваўся разам з героямі. Быў мітуслівы «маленькі чалавек» Цярэшка Калабок, з рухаў і слоў якога можна было з задавальненнем усміхнуцца. Ён такім і застаўся, толькі ў момант ты разумееш, што Цярэшка — не здраднік, не ахламон, не нямецкі ліслівец. Таму што новая пасада яго — сакрэтнае партызанскае заданне. Шчаўчок. Цярэшка аказваецца на другім баку (дзе выглядае ўжо больш арганічна), на якім і словы яго, той жа «таварыш», падаюцца мнагазначнымі, бясконцая цярплівасць да выбрыкаў ганарлівага Сырадоева — геройскай. «Маленькі чалавек» раптам становіцца вартым і дужым.

Рэжысёр удала паманіпуляваў глядацкімі чаканнямі. Нягледзячы на тое, што Цярэшка ў сям'і, якая люта ненавідзіць ворагаў, з новай пасадай выглядае незвычайна, рэжысёр змог гэты падман захаваць да таго самага шчаўчка, а намёкі прыраўняць да выпадковасцяў. Наўмысна. У той час як нечага выключнага з пачатку чакаеш ад Валодзькі.

Супраць бацькі паўсталі ўсе члены сям'і, адназначна адданыя непарушным каштоўнасцям сваёй краіны. І Цярэшка нават рады гэтаму факту, таму што ён так выхоўваў сваіх дзяцей, укладваў у іх светаўяўленне і патрыятызм.

Напрыканцы спектакля гучыць песня са словамі «што пасееш, то і пажнеш».

Учыніць суд над мужам/родным бацькам з прычыны яго вонкавай здрады Радзіме — гэта тое ж самае, што Аўрааму аддаць у ахвяру Богу свайго сына Ісаака. На шчасце, ні ў тым, ні ў іншым выпадку справа не дайшла да канца, але разам з гэтай параллеллю Радзіма даволі пафасна суадносіцца з Богам і становіцца ў шэраг неабвержных каштоўнасцяў. Не паспрачаешся.

Прэм'ера спектакля 17 сакавіка

Учыніць суд над мужам/родным бацькам з прычыны яго вонкавай здрады Радзіме — гэта тое ж самае, што Аўрааму аддаць у ахвяру Богу свайго сына Ісаака.

Але і ў біблейскім апавяданні замест сына прыйшлося нечым ахвяраваць. Дзеля Бога. Спектакль Новага драматычнага тэатра таксама скончыўся ахвярай. Дзеля Радзімы.

Падчас пастаноўкі нельга не падумаць: як добра, што праз семдзесят гадоў (пяцьдзясят, дзевяноста) поўны зал тэатра можа з такой лёгкасцю смяяцца з крыху пікантных сітуацый у сялянскай хаце падчас вайны. І смяяліся — а п'еса Макаёнка даўно з поспехам выкарыстоўваецца рознымі тэатрамі, у тым ліку замежнымі. І будуць смяяцца.

Такая трагікамедыя можа захаваць памяць пра вайну, адзначыць юбілей Перамогі, але і прымусіць з палёгкай уздыхнуць (у нас жа «мірнае неба над галавой») і дазволіць шчасліва ўсміхнуцца таму, што ўсё гэта так далёка.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

Смелая вясна Наталлі Табушавай

У чым тоіцца прыгажосць? Прыгажосць вясновай прыроды, якая за зіму паспела добра адпачыць, выспацца, прыгажосць беларускіх жанчын, якія расцвілі, быццам кветкі? Прыгожае і жыццярадаснае схавана ў карцінах беларускай мастачкі Наталлі Табушавай.

Выстава яе работ знайшла прытулак у Доме дружбы сталіцы. Залу ахутваюць салодка-далікатныя пахі жывапісных кветак Наталлі Табушавай і вершы знакамітых паэтаў, сярод якіх У. Шэкспір, М. Буанароці, А. Майкоў, М. Валошын, А. Фет... Вясновыя вобразы паэтаў і мастачкі гарманічна пераплятаюцца пад спакойную мелодыю ў хвалюючым танцы. Вяснова-летнія карціны дыхаюць, кветкі быццам жывыя творы прыроды. Свежасцю, спакоем і ўнутранай ціхай радасцю напоўнена зала ў малочна-залацістых тонах...

Жывапісныя палотны, прадстаўленыя на выставе, можна падзяліць на дзве групы: нацюрморты з кветкамі і партрэты жанчын. Партрэт — любімы жанр Наталлі, бо яна раскрывае характэрныя рысы чалавека, ягоную псіхалогію і душу.

Твары жанчын з карцін не проста паглядаюць на наведвальнікаў, а чакаюць дыялогу з ім, каб расказаць сваю гісторыю. «Партрэт архітэктара Л. Луцэвіч» выкананы ў насычаных, яркіх, сіне-зялёных адценнях. На карціне — маці Наталлі. Годная, упэўненая ў сабе. Але галоўнае — гэта яе добрыя блакітныя вочы. Нягледзячы на тое, што работа напісана ў халоднай гаме, ад яе ўсё роўна зыходзяць пяшчотная цеплыня і спакой.

«Чырвоны студзень. Аўтапартрэт» — работа ў вішнёвых і рабінавых тонах раскрывае тое патаемнае, інтымнае, што ад нас хоча схаваць мастачка. Кажуць, што мастацтва трэба не разумець, а адчуваць. І гэта сапраўды так. Ад карціны ідзе імпульс, энергія.

Нацюрморты Наталлі Табушавай выкананы ў моцнай гаме эмоцый і адчуванняў, што так яскрава выяўлена ў жывапісных палотнах. «Клубніцы і шыпшына» — светлая карціна, мазкі свабодныя, энергічныя. Здаецца, што Наталля, як і яе карціны, — адкрытая да ўсяго новага і незвычайнага.

Уразіла жыццярадасная карціна «Дзьмухаўцы», якая вылучаецца сярод астатніх работ жаўтавата-арэхавай гамай. Галоўныя героі — сонечныя дзьмухаўцы — цягнуць свае галоўкі да сонца, каб наталіць смагу жамчужным святлом.

— Я люблю ўсе колеры, — патлумачыла мне Наталля. — Але мае карціны, у асноўным, халодных тонаў. Як кажуць: імі пішуць каларысты, а цёплымі — танавікі. Нядаўна прачытала цікавы факт: існуе чырвоны агонь і сіні агонь (свет зорак, лямпы). І вось гэты сіні агонь больш небяспечны: у яго тэмпература вышэйшая, чым у чырвонага агню.

Вясновыя вобразы Наталля Табушава паказала праз колер. І яе вясна не напаўпразрыстая і акварэльная, а жывая, яскравая, смелая.

Вольга РОПАТ.



Элементы благоустройства, д. Боровка.



ТАМ ХОРОШО,ГДЕ МЫ ЕСТЬ!

КУПП «Боровка» Лепельского района отмечает 20-летие!

«Прописка – сельская, качество жизни – городское» — лозунг работников КУПП «Боровка» Лепельского района.

Получив в наследство запущенный жилой фонд бывших военных городков Боровка, Заслоново и Межица, коллектив за несколько лет не только превратил их в благоустроенные поселки, но и стал одним из лучших в стране: предприятие входит в список эталонных в номинации «Эксплуатация жилищного фонда».

Целью и предметом деятельности предприятия является качественное безаварийное обеспечение д. Боровка и близлежащих деревень, агрогородков водоснабжением, водоотведением, тепловой энергией, санитарной очисткой, выполнение параметров социальных стандартов в системе жилищно-коммунальных услуг, снижение уровня существующих затрат, экономия топливно-энергетических ресурсов, а также извлечение прибыли для дальнейшего функционирования предприятия.

Работа коммунальников на селе имеет свою специфику: они обеспечивают практически все насущные потребности человека. Часто решение вопросов, которые сложно отнести к чьей-либо компетенции, ложится на коллектив «Боровки». Каждый год предприятие внедряет новые услуги и создает рабочие места, что также немаловажно в поселках, где нет никаких производств.

Приближается наш праздник, дорогие работники ЖКХ!
От всей души поздравляем всех, кто трудится на этом поприще!
Желаем творческих успехов, здоровья и хорошего настроения!

Наши возможности:
- услуги прачечной;
- бани;
- парикмахерские услуги;
- розничная торговля;
- ритуальные услуги;
- прокат;
- ремонт бытовой техники, телевизоров;
- химчистка, чистка подушек;
- ремонтно-строительные работы;
- установка и обслуживание счетчиков;
- транспортные услуги, стоянка.

Предприятие имеет производственный участок, который выпускает готовую продукцию: тротуарную плитку, железобетонные изделия, столярные изделия, щепу. **Открыто новое производство топливных брикетов и пеллет, которые реализуются на внутреннем и внешнем рынках (Польша, Литва, Латвия, Германия и Бельгия.)**

Процесс обустройства дворовой территории дома № 13, д. Боровка. Детская игровая площадка, д. Боровка.

■ Творческий подход

Коммунальное унитарное производственное предприятие
«Боровка»
211194, РБ, Витебская область, Лепельский район, д. Боровка, д. 20а
Тел./факс: (2132) 2-76-43
kypp@yandex.ru УНП 300325545

«Клиент всегда прав!»

Этот девиз **директор предприятия Владимир АКСЕНОВИЧ** сразу поставил во главу угла, подкрепив его незыблемым правилом: отсутствие аварийных ситуаций и жалоб – главный критерий оценки работы каждого специалиста.

Коммунальная служба в «Боровке» — одна из немногих, где практически нет негативных письменных обращений, и это при том, что зона обслуживания – почти полрайона. Диспетчерская служба здесь давно трудится в круглосуточном режиме, обращения фиксируются компьютерной программой, дополнительно заводится специальная карточка.

Приоритетный «ориентир на людей» постоянно подсказывает новые шаги в развитии сферы услуг. Поскольку не все услуги, оказываемые предприятием, востребованы ежедневно, многие из сотрудников совмещают несколько функций, чтобы избежать чрезмерного раздувания штата.

Так держать!

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование:
Открытое акционерное общество

«Чернавчицкий завод железобетонных изделий»

Адрес: 225030, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г,
Брестский район, Брестская область
Единица измерения: млн. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	4 752	4 728
Нематериальные активы	120	5	1
Прочие долгосрочные активы	180	38	–
ИТОГО по разделу I	**190**	**4 795**	**4 729**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	2 549	2 583
Расходы будущих периодов	230	1	8
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	3	2
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	1 750	1 239
Денежные средства и их эквиваленты	270	53	315
ИТОГО по разделу II	**290**	**4 356**	**4 147**
БАЛАНС	**300**	**9 151**	**8 876**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	6 078	2 786
Резервный капитал	440	223	223
Добавочный капитал	450	352	1 551
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	1 070	1 888
ИТОГО по разделу III	**490**	**7 723**	**6 448**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	1 428	2 428
ИТОГО по разделу V	**690**	**1 428**	**2 428**
БАЛАНС	**700**	**9 151**	**8 876**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За 2014 год	За 2013 год
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	20 794	22 640
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	17 306	19 084
Валовая прибыль (010 - 020)	030	3 488	3 556
Управленческие расходы	040	1 940	1 873
Расходы на реализацию	050	236	209
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050)	060	1 312	1 474
Прочие доходы по текущей деятельности	070	559	560
Прочие расходы по текущей деятельности	080	608	465
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060 + 070 - 080)	090	1 263	1 569
Доходы по инвестиционной деятельности	100	116	113
Расходы по инвестиционной деятельности	110	37	25
Доходы по финансовой деятельности	120	–	1
Расходы по финансовой деятельности	130	67	89
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 - 110+120-130±140)	140	12	–
Прибыль (убыток) до налогообложения (±90 ±150)	150	1 275	1 569
Налог на прибыль	160	245	280
Чистая прибыль (убыток) (±160 - 170 ±180 ± 190 - 200)	210	1 030	1 289
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	344	645
Совокупная прибыль (убыток) (±210 ±220 ± 230)	240	1 374	1 934
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	0,061008	0,076349
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	0,061008	0,076349

Данные отчетности подтверждены:
ИП Климович М.М., свидетельство № 0265315 от 02.03.2011 г.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОАО

4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): 0

5. Количество акционеров – всего – 114, в том числе юридических лиц – 0, физических лиц – 114.

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Ед. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	64,78	38,31
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	млн руб.	64,78	38,31
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	3837	2269
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	руб.	3837	2269
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	457,4	381,9
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	0	0
7-8. Отдельные финансовые результаты			
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн руб.	20 794	22 640
Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	млн руб.	19 482	21 166
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего	млн руб.	1 275	1 569
В том числе:			
прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн руб.	1 312	1 474
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	млн руб.	-49	95
прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	млн руб.	12	0
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли	млн руб.	245	280
Чистая прибыль (убыток)	млн руб.	1 030	1 289
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	млн руб.	1 070	1 888
Долгосрочная дебиторская задолженность	млн руб.	0	0
Долгосрочные обязательства	млн руб.	0	0
Среднесписочная численность работающих	человек	82	85
